ТУРЫСТЫ НА БАЛОЦЕ 7

ПІРАГРАФІЯ – МАЛЯВАННЕ АГНЁМ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. СЕРАДА № 190 (28806)

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Дзмітрый ЛАПКО, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Нягледзячы на высокую нявызначанасць на знешніх рынках і ўнутраныя ўразлівасці, Нацбанк разлічвае ўтрымаць сёлета інфляцыю ў межах прагнозу — 5,5-6 %. Калі казаць аб магчымым далейшым зніжэнні стаўкі рэфінансавання, то тут шмат няпэўнасці, мы будзем сачыць за сітуацыяй. Пакуль стаўка застаецца на рэкордна нізкім узроўні, 10 %. Пры гэтым Цэнтрабанк Расіі нядаўна вымушаны быў павысіць стаўку. У рамках павышаных геапалітычных рызык гаварыць пра тое, якія мы будзем прадпрымаць дзеянні далей у гэтым кірунку, рана».*

## КАРАТКА

- **Увядзенне ў Беларусі біяметрычных дакументаў перанесена на 2020 год з-за інтэграцыі інфармацыйных сістэм.**
- Беларускі транспартны тыдзень адкрыўся 2 кастрычніка на пляцоўцы Футбольнага манежа ў Мінску.

- **Азімыя збожжавыя, паводле даных на 2 кастрычніка, пасеяны на плошчы большай за 1,2 млн га (95,6 працэнта ад плана).**
- Авіякампанія «Белавія» зможа прадаваць білеты па безбагажных тарыфах, для гэтага плануецца ў хуткім часе ўнесці змены ў заканадаўства.
- **Міністэрства інфармацыі Беларусі аб'явіла конкурс па распрацоўцы архітэктурнай канцэпцыі будынка медыяцэнтра.**

ISSN 1990 - 763X

# Карані і карэньчыкі

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**Для генеральнага дырэктара ААТ «Трэст «Шахтаспецбуд» Дзяніса ДЗІУЛІНА тыя кароткія гадзіны, якія ён можа выкраіць для сям'і, — сапраўднае свята.**

**Часцей жа Дзяніса Аляксандравіча можна сустрэць на аб'ектах ААТ «Беларуськалій»: ці глыбока пад зямлёй на ўскрыцці новых гарызонтаў Старобінскага радовішча калійных соляў, ці на ўзвядзенні Петрыкаўскага ГУКа. А яшчэ на перагаворах з замежнымі партнёрамі аб удзеле трэста ў асваенні залежаў карысных выкапняў — без перабольшання, па ўсім свеце.**

**Вось і атрымліваецца, што «трэба дома бываць часцей», як пісаў паэт. Тым больш што з домам звязваюць моцныя карані, мацней не бывае.**

**НА ЗДЫМКУ: Дзяніс Дзіулін з дзеткамі Верай і Ільёй на Алеі славы раёна каля партрэта свайго дзеда — Аляксандра Іосіфавіча Дзіуліна, таксама калійшчыка, ветэрана вайны. Ды не проста ветэрана, а кавалера ордэна баявой салдацкай Славы ўсіх трох ступеняў, што афіцыйна прыраўноўваецца да звання Героя Савецкага Саюза.**

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

## Законы для ўстойлівага росту

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М. У. Мясніковіча на адкрыцці пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!

Прайшла сярэдзіна пяцігодкі. За гэты час створаны «заканадаўчы каркас» для рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады і палажэнняў дэкрэтаў Прэзідэнта № 7, № 8, № 1 і іншых дырэктыўных дакументаў. Але жыццё патрабуе дадатковых парламенцкіх высілкаў. Трэба будзе аператыўна распрацаваць і прыняць шэраг законапраектаў у сферы электраэнергетыкі, гандлю, карпаратыўных адносін і іншых.

Заканадаўчае забеспячэнне рашэнняў кіраўніка дзяржавы — ключавая задача парламента і ўрада.

Парадак бягучай сесіі будзе вельмі насычаны. Нам трэба будзе разгледзець больш за 30 законапраектаў.

Прыярытэт нумар адзін — праца над бюджэтным пакетам і планам падрыхтоўкі законапраектаў на наступны год. Мы ўнеслі прапанову, каб гэтыя дакументы фарміраваліся на двухгадовы перыяд: 2019—2020 гады. Гэта дазволіць стварыць неабходны зачын у заканадаўстве на наступную пяцігодку. Пры гэтым важна, каб працаваў пакетны прынцып падрыхтоўкі законапраектаў. Як прыхільнік доўгатэрміновага планавання лічу аптымальным зрабіць праект гібрыднай сямігодкі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, а менавіта канкрэтную двухлетку на 2019—2020 гады і асноўныя палажэнні да 2025 года. І пад гэта павінна быць адпаведнае заканадаўства.

СТАР. 3

## Моцная эканоміка — гарантыя незалежнасці, сацыяльнай стабільнасці і дастойнай якасці жыцця

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на адкрыцці пятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*

Паважаныя дэпутаты, члены ўрада і запрошаныя!

Пачынае работу пятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

Яе парадак дня адлюстроўвае комплекс важных задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы, па вывадзе нацыянальнай эканомікі на апераджальныя тэмпы росту. Сёння гэта падтрымка малога і сярэдняга бізнесу, стварэнне прывабнага інвестыцыйнага асяроддзя, актыўнае развіццё лічбавых тэхналогій. Толькі моцная сучасная эканоміка з'яўляецца гарантыяй незалежнасці, сацыяльнай стабільнасці, бяспекі і дастойнай якасці жыцця грамадзян Беларусі.

Вырашэнне гэтых задач патрабуе зладжанасці і дакладнасці дзеянняў усіх дзяржаўных органаў, забеспячэння строгай кіраўніцкай, выканальніцкай і тэхналагічнай дысцыпліны.

Важную ролю ў гэтым павінна адыграць і праграма дзейнасці абноўленага ўрада, якую мы разгледзім у ходзе сесіі.

Пры яе абмеркаванні трэба помніць, што эканоміка — гэта сфера адказнасці і парламента. Дэпутаты актыўна працуюць з выбаршчыкамі, дакладна ўяўляюць сабе ўвесь комплекс праблем на месцах і павінны максімальна ўважліва і прагматычна падысці да разгляду прапаноў урада.

СТАР. 3

# УЗГОДНЕНА. З ПАПРАЎКАМІ

## Прэзідэнту далажылі аб праекце ўказа па кіраванні радыёчастотным спектрам

**Кіраўнік дзяржавы ў цэлым ухваліў праект указа, але — з некаторымі дапрацоўкамі. Аб гэтым па выніках нарады ў Аляксандра Лукашэнкі расказаў міністр сувязі і інфарматызацыі Беларусі Канстанцін Шульган.**

На нарадзе Аляксандр Лукашэнка папрасіў міністра растлумачыць, для чаго неабходны такі ўказ. «Мы шмат гадоў працуем па кіраванні радыёчастотным спектрам. Быццам бы не было ніякіх пытанняў... Што, няправільна кіравалі, няправільна размяркоўвалі? Хтосьці плаціць, не плаціць? Што новага такога, каб Прэзідэнт вяртаўся да гэтага пытання?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы ў Канстанціна Шульгана.

Акрамя таго, беларускі лідар папрасіў адказаць на іншае пытанне, якое вынікае з першага:

«Мы ў цяперашніх умовах нарматыўна-прававога рэгулявання гэтай праблемы працаваць не можам? Калі не можам, ну што ж, тады будзем звяртацца да гэтага пытання і рыхтаваць адпаведны ўказ Прэзідэнта. Гэта значыць, комплекс пытанняў, звязаны з праектам цяперашняга ўказа».

Таксама Прэзідэнт пацікавіўся ў міністра, якая сітуацыя ў сферы (нагадаем, на пасаду Канстанцін Шульган заступіў у сярэдзіне жніўня), а таксама спытаў пра найбліжэйшыя планы.

Па словах Канстанціна Шульгана, указ можна падзяліць на тры часткі. Першая — асноўная — гэта напрацоўка тых момантаў, якія ўзніклі пры кіраванні раней. Неабходна прывесці юрыдычную базу ў адпаведнасць з практыкай работы для таго, каб рашэнні прымаліся мабільна, лішні раз не трэба было разважаць, што правільна, а што не, дадаў ён. Па словах міністра, такіх момантаў у прапанаваным праекце ўказа — каля 90 %.

У прыватнасці, у праекце ўказа прапануецца наступнае. Па-першае, ускласці на Дзяржаўную інспекцыю Беларусі па электрасувязі Мінсувязі функцыі па выдачы дазволаў на эксплуатацыю суднавых радыёстанцый з прысваеннем міжнародных пазыўных ці іншых апазнавальных сігналаў. Па-другое, устанавіць у рамках дэдалярызацыі эканомікі ў беларускіх рублях замест еўра стаўкі, якія ўжываюцца пры разліку памераў платы за вылучэнне і выкарыстанне радыёчастотнага спектра. Па-трэцяе, прапануецца ўдасканаленне працэсаў часовага ўвозу радыёэлектронных сродкаў, што выкарыстоўваюцца ў ходзе падрыхтоўкі і правядзення такіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца па рашэнні Прэзідэнта або Савета Міністраў. Гэтыя меры дадуць магчымасць у тым ліку ўдзельнікам II Еўрапейскіх гульняў 2019 года, замежным асобам, якія асвятляюць згаданыя гульні, гасцям часова ўвозіць і выкарыстоўваць радыёстанцыі без неабходнасці іх рэгістрацыі і ўнясення платы за выкарыстанне спектра. Па-чацвёртае, устанавіць асноўныя палажэнні міжнародна-прававой абароны частотных прысваенняў Беларусі. Змены і дапаўненні ўносяцца ў некаторыя ўказы.

Па выніках нарады Канстанцін Шульган пагутарыў з журналістамі.

Ён расказаў, што ўказ сапраўды спецыялізаваны, больш прафесійны. «Гэта работа ў нашай дзяржаве праводзілася, няма тых момантаў, без якіх мы не можам працаваць далей. Але разам з тым былі зроблены пэўныя акцэнты на тыя рэчы, якія трэба палепшыць, прадставіць па-іншаму», — сказаў Канстанцін Шульган.

На думку міністра, трэба палепшыць тое, што ўплывае на арганізатарскую работу, неабходную пры выдзяленні радыёчастотнага спектра. «З гэтым сутыкаюцца ўсе, сотавымі тэлефонамі карыстаемся. Мабільныя аператары атрымліваюць частку радыёчастотнага спектра, дзе арганізуюць перадачу сігналу для нашай сотавай сувязі, — сказаў ён. — Таму вось гэтыя моманты яшчэ трэба дапрацаваць. Так было сказана Прэзідэнтам».

З нагоды свайго першага месяца на пасадзе міністра Канстанцін Шульган адзначыў, што кіраўніка дзяржавы цікавіла пытанне, як міністэрства гатова да выканання тых задач, якія былі агучаныя падчас яго прызначэння. «Былі зроблены пэўныя ўказанні па фарміраванні, змене пад гэтыя задачы самой структуры і штата Міністэрства сувязі без павелічэння колькасці.

Таксама былі вызначаны пытанні ўзаемадзеяння з іншымі прадпрыемствамі, якія працуюць у сферы лічбавізацыі эканомікі, тыя галіны, якія ў першую чаргу, напэўна, павінны будуць укараніць новыя тэхналогіі, каб мы атрымалі нейкі эфект. Была ўдзелена ўвага, што гэта міністэрствы аховы здароўя, адукацыі, Парк высокіх тэхналогій», — дадаў ён.

Што датычыцца перадачы часткі радыёчастотнага спектра пад сетку 5G, то тут міністр расказаў, што неабходныя частоты не занятыя, іх можна вылучаць, але існуе асаблівасць цаны ў залежнасці ад той частаты, якая неабходна для гэтай тэхналогіі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# З ГУСТАМ І КАМФОРТНА

## Беларускаму лідару паказалі форму спартсменаў і валанцёраў да II Еўрапейскіх гульняў

**Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў дызайнера Юліі Латушкінай, якая распрацоўвала частку калекцыі, як успрымаюць форму простыя людзі. Акрамя таго, на думку Аляксандра Лукашэнкі, трэба, каб дзяржаўны герб быў вышыты на форме, а не «налеплены».**

Фота БелТА.

Таксама Прэзідэнт пацікавіўся ў дызайнера, чаму ніз ва ўзнагародным касцюме яна зрабіла ў выглядзе спадніцы-сукенкі і штаноў. Яна растлумачыла гэта тым, што касцюм для ўзнагароджвання павінен прыцягваць увагу, а лёгкая спадніца стварае эфект хвалі.

Што датычыцца валанцёрскай формы, то Юлія Латушкіна расказала, што вывучала замежны вопыт, напрыклад Сочынскай алімпіяды.

Генеральны дырэктар прадпрыемства «Сола-Пінск» Васіль Гарагляд расказаў беларускаму лідару аб іншай частцы калекцыі, паколькі яе распрацоўвала яго прадпрыемства. Форма зроблена па сучасных тэхналогіях, яе назва — «Прастора», што сімвалізуе бязмежныя беларускія прасторы.

Па выніках дэманстрацыі з журналістамі паразмаўляла дызайнер Юлія Латушкіна.

«Кіраўнік дзяржавы паглядзеў узоры, у прынцыпе ўсё досыць добра. Па маёй частцы — я распрацоўвала парадна-грамадзянскую форму, форму ўзнагароднай групы і валанцёраў. Ёсць, адпаведна, невялікія карэкціроўкі, якія я сама ведаю: у нас заўсёды ёсць пытанне з размяшчэннем герба, і кіраўнік дзяржавы неаднаразова нам казаў, каб герб быў вышыты непасрэдна на самім адзенні, а не прышпільваўся. Таму мы гэтыя карэкціроўкі ўнясём», — сказала дызайнер.

Цікава, што пры распрацоўцы формы прадпрыемства праводзіла апытанне сярод спартсменаў, Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі ўжо пяты па ліку варыянт.

Што датычыцца вольнага продажу формы, то Васіль Гарагляд адзначыў, што ў продаж калекцыя часткова паступіць у канцы года.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Спорт пад апекай

**Указ пра абнаўленне складу Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні II Еўрапейскіх гульняў 2019 года ў Беларусі падпісаў Прэзідэнт нашай краіны.**

Карэкціроўкі звязаны са зменамі ў складзе ўрада і кіраўніцтве рэспубліканскіх арганізацый. Такім чынам, старшыня аргкамітэта — прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас, яго намеснікі — віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка і міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук. Таксама ў склад увайшлі міністр фінансаў Максім Ермаловіч, міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган, старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант, першы сакратар Цэнтральнага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Дзмітрый Варанюк.

**Паводле БелТА.**

# ЗМАГАЦЦА З П'ЯНСТВАМ І АЛКАГАЛІЗМАМ НЕАБХОДНА НЕ АДНАБОКІМІ ЗАБАРОНАМІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка распарадзіўся на працягу сутак адмяніць абмежаванні продажу алкаголю ў гандлёвай сетцы ў начны час з 23.00 да 07.00, якія ў парадку эксперымента ўведзены з 1 кастрычніка ў Мінску і месцамі на раённым узроўні. Аб гэтым БелТА паведамілі ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.**

«Прэзідэнт, азнаёміўшыся з прадстаўленай яму інфармацыяй, прыняў рашэнне на працягу сутак адмяніць гэтыя непрадуманыя рашэнні», — заявілі ў Адміністрацыі.

Такое рашэнне кіраўніка дзяржавы прадыктавана тым, што змагацца з п'янствам і алкагалізмам неабходна не такімі аднабокімі забаронамі, якія на практыцы замест чаканага станоўчага выніку прыводзяць да росту ценявога рынку і крымінальнай сферы, у тым ліку павелічэння прапанавання кантрафактнай прадукцыі.

Адзначаецца, што вопыт як Беларусі, пачынаючы з савецкіх часоў, так і замежных краін сведчыць аб неэфектыўнасці і нават шкоднасці забарон. Часам непрадуманыя рашэнні ў гэтым ключы набывалі самыя гіпертрафіраваныя формы, аж да высечкі вінаграднікаў, што на доўгія гады практычна знішчыла цэлыя галіны сельскай гаспадаркі ў шэрагу краін.

«З іншага боку, попыт заўсёды знаходзіць прапанаванне. Продажы з-пад крыса тымі ж таксістамі, рост ужывання любых спіртазмяшчальных вадкасцяў, праблема кантрафакту ва ўмовах немагчымасці кантраляваць сітуацыю ў рамках цывілізаваных умоў гандлю... І як вынік — павелічэнне колькасці правапарушэнняў і алкагольных атручэнняў, дадатковая нагрузка на сістэму аховы здароўя і расход бюджэтных сродкаў. Усё гэта таксама найбольш магчымыя наступствы такіх забарон», — падзяліліся ў Адміністрацыі Прэзідэнта падаплёкай прынятага рашэння.

Пры гэтым падкрэсліваецца, што вырашэнне існуючай праблемы павінна быць комплексным з галоўным упорам на меры прафілактычнага і выхаваўчага характару, фарміравання моды на здаровы лад жыцця.

Як паведамлялася, раней у Мінску было прынята рашэнне абмежаваць продаж алкагольных напіткаў у начны час да 1 кастрычніка 2019 года. З 23.00 да 7.00 у гандлёвай сетцы забаронена рэалізацыя гарэлкі, лікёра-гарэлачных вырабаў, віна, каньяку, брэндзі, кальвадосу, шампанскага і іншых напіткаў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту сямі працэнтаў і больш, а таксама піва і слабаалкагольных напіткаў. Прадаваць алкаголь у гэты час могуць толькі аб'екты грамадскага харчавання ў разліў. Да гэтага эксперымента месцамі падключыліся і на раённым узроўні.

Парламенцкі дзённік

# У дэпкорпуса восеньская сесія

## На парадку дня праекты, накіраваныя на разняволенне дзелавой ініцыятывы

**У першы дзень восеньскай сесіі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў першым чытанні разгледзелі папраўкі ў законы аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва, дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях, трансплантацыі органаў і тканак чалавека, аб абыходжанні з адходамі, гарантаванні пагранічнай бяспекі.**

Таксама разгледзелі папраўкі, якія павінны ўдасканаліць Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Сярод законапраектаў, падрыхтаваных да разгляду ў другім чытанні, дэпутаты абмеркавалі ўнясенне змяненняў у законы аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі, аб транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці, аб электронным дакументе і электронным лічбавым подпісе, аб бяспецы генна-інжынернай дзейнасці.

Акрамя таго, ратыфікавалі міжнародныя дагаворы з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, Азіяцкім банкам інфраструктурных інвестыцый.

З прапановамі аб папраўках у закон «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва» выступіў **міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА.** Гаворка ішла і пра тое, каб дапоўніць пералік аб'ектаў, якія падлягаюць санітарна-гігіенічнай экспертызе і рэгламентаваць асобныя пытанні, якія датычацца выдачы санітарна-гігіенічнага заключэння. Не менш важна ўдакладніць правы органаў і ўстаноў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд, іх службовых асоб, а таксама абавязкі арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў у галіне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва.

У сваю чаргу дэпутат Брэсцкай-Усходняй выбарчай акругі № 3 Анатоль Дашко задаў пытанне Валерыю Малашку пра тое, як сёння Міністэрства аховы здароўя працуе, каб патрабаванні і нарматывы хутчэй укараняліся ў работу Дэкрэта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва».

Па словах міністра, дакумент па працы з гэтымі патрабаваннямі ўжо выпрацаваны і знаходзіцца на ўзгадненні ў міністэрстве юстыцыі.

«Што ж датычыцца санітарных правілаў, то мы чуем сёння прапановы, якія паступаюць з боку прадпрымальнікаў. У гэтай частцы нормы закона разглядаюць нейкія паслабленні», — адзначыў міністр.

Пры гэтым ён удакладніў, што бізнесу аслабяць санітарны кантроль у тых выпадках, дзе не будзе рызыкі негатыўнага ўплыву на здароўе чалавека.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# Законы для ўстойлівага росту

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прапаную таксама рэалізаваць двухгадовае планаванне і на мікраўзроўні — усе валаўтваральныя прадпрыемствы і арганізацыі павінны абараніць свае бізнес-планы на 2019 і 2020 гады ў спецыяльна створаных камісіях з ліку прадстаўнікоў мясцовай улады і рэспубліканскіх органаў. Дадзены падыход дазволіць выпрацаваць механізмы рэалізацыі прагнозу і бюджэту «знізу», ацаніць здольнасць кадраў на месцах выконваць мэтавыя задачы. Супраць такога, хутчэй за ўсё, будуць выступаць як рэспубліканскія, так і мясцовыя органы. І не таму, што гэта няправільна, а таму, што гэта сур'ёзная і адказная работа. Але рабіць яе трэба, трэба бачыць вузкія месцы ў развіцці і своечасова вырашаць складаныя задачы. Прашу падтрымаць.

Прыярытэтнай павінна заставацца работа Савета Рэспублікі па заканадаўчым забеспячэнні эфектыўнай інвестыцыйнай дзейнасці. Наша задача — стварыць камфортнае прававое асяроддзе для больш актыўнага прыцягнення інвестыцый у эканоміку краіны як галоўнага інструмента развіцця. Неабходна ўмацоўваць давер інвестараў: сваіх і замежных.

Парламентарыі і эксперты, працуючы з законапраектамі, абавязаны асаблівую ўвагу ўдзяляць інавацыйнай і фінансавай бяспецы краіны. Імпарт, асабліва па звязаных крэдытах, неабходна кантраляваць на адпаведнасць тэхналогій, якія закупаюцца, сусветнаму ўзроўню і забеспячэнне гарантаваных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, якія ў іх змяшчаюцца.

У гэтай сувязі павінна ўзрасці роля навуковай экспертызы законапраектаў і дагавораў і пагадненняў, якія ратыфікуюцца, у тым ліку пра фінансавыя запазычанні. Навукова-інавацыйныя, гандлёвыя, фінансавыя і іншыя рызыкі павінны быць сур'ёзна пралічаныя, як і дакладнасць наяўнасці належнага кадравага забеспячэння новых вытворчасцяў.

Глядзіце, як патрабавальныя ЗША ў дачыненні да краін, якія запазычылі амерыканскія тэхналогіі. Менавіта гэта, шмат у чым, спарадзіла гандлёвыя войны.

Нам трэба будзе разгледзець новую рэдакцыю Падатковага кодэкса. Кожны член Савета Рэспублікі павінен, вобразна кажучы, прымерыць праектныя нормы і Падатковы кодэкс у цэлым да сваёй арганізацыі. Патрабаванне кіраўніка дзяржавы ў частцы падатковага заканадаўства вядомае: забяспечыць прастату і зразумеласць нормаў Кодэкса, а таксама аптымізацыю падатковай нагрузкі для бізнесу.

Найважнейшым законапраектам, які плануецца да прыняцця на гэтай сесіі, з'яўляецца праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях пітнога водазабеспячэння». У час асабістых прыёмаў і сустрэч з грамадзянамі, якія праводзяцца членамі Савета Рэспублікі, даводзіцца чуць скаргі на нездавальняючую якасць пітной вады ў шэрагу населеных пунктаў. Пытанне не надуманае, і ім трэба займацца прадметна. На жаль, паважаныя старшыні абласных Саветаў дэпутатаў, вы яго адкладаеце на потым. Сродкі, вядома, патрэбныя, але яны не гэткія велізарныя. Усё можна вырашыць паэтапна.

Прашу ўсіх членаў Савета Рэспублікі яшчэ раз вывучыць становішча названага законапраекта. Далажыце ў пастаянных камісіях свае меркаванні і прапановы.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Актыўная і насычаная міжнародная дзейнасць у міжсесійны перыяд была накіравана на пашырэнне міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

Прайшлі візіты ў Беларусь кіраўніка Сената парламента Польшчы і старшыні парламента Ірана, а таксама візіты дэпутацкіх груп дружбы Фінляндыі і Японіі. Адбыліся канструктыўныя сустрэчы з высокай дэлегацыяй Кампартыі Кітая і кіраўніцтвам Лацінаамерыканскага парламента і многімі іншымі замежнымі партнёрамі з В'етнама, Ірана, Узбекістана, з кіраўніком місіі МВФ, прадстаўнікамі навукі і бізнесу Карэі і Японіі. З некаторымі з іх падпісаны дакументы аб развіцці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Значным мерапрыемствам міжнароднага фармату парламенцкай работы стала правядзенне ў Мінску Саветам Рэспублікі і кіраўніцтвам Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы саміту па пытаннях мясцовага самакіравання.

Стала больш сістэмным і рэгулярным запрашэнне і ўдзел беларускіх сенатараў у міжнародных мерапрыемствах.

Зараз Савет Рэспублікі чакае з візітам старшыню Сената парламента Казахстана і шэраг іншых парламенцкіх дэлегацый.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

На наступным тыдні адбудзецца найважнейшае мерапрыемства: юбілейны V Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, якое праводзіць Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савет Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі. Упершыню ён пройдзе ў рэгіёне — у Магілёве і Магілёўскай вобласці. Чаканні ад гэтага мерапрыемства вялікія. Плануецца падпісаць новыя пагадненні аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі і шматмільённыя камерцыйныя экспартныя кантракты. Свой удзел у Форуме пацвердзілі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. У. Пуцін. На сёння паступілі заяўкі на ўдзел у Форуме 21 губернатара і 16 кіраўнікоў прадстаўнічых органаў улады расійскіх рэгіёнаў.

Паважаныя калегі!

На сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, якая адбылася 21 верасня ў Сочы, прынятыя важныя рашэнні па ключавых пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва. Наша, парламентарыяў, задача — забяспечыць заканадаўчае суправаджэнне гэтых рашэнняў. Мяркую, што пляцоўка Форуму рэгіёнаў будзе спрыяць замацаванню сочынскіх дамоўленасцяў.

Паважаныя таварышы!

Прэзідыум Савета Рэспублікі сваім рашэннем ад 29 жніўня 2018 года зацвердзіў канкрэтны план дзеянняў па рэалізацыі даручэнняў кіраўніка дзяржавы, дадзеных у 2018 годзе ў ходзе найважнейшых сацыяльна-палітычных і эканамічных мерапрыемстваў. Гэты план павінен стаць «дарожнай картай» для кожнага сенатара з улікам мэтавай установкі Прэзідэнта краіны — павышэнне эфектыўнасці сістэмы дзяржаўнага кіравання на аснове ўзгодненасці дзеянняў, адзінства і паслядоўнасці мэт. Прашу прыняць яго да выканання.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Дазвольце павіншаваць вас з пачаткам чарговай сесіі Савета Рэспублікі. Жадаю ўсім плённай працы.

# Моцная эканоміка — гарантыя незалежнасці, сацыяльнай стабільнасці і дастойнай якасці жыцця

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З аналагічных пазіцый трэба ацэньваць пакет бюджэтных дакументаў, падатковага заканадаўства. Асаблівы акцэнт трэба зрабіць на эфектыўнасці мэтавых праграм, на пытаннях інавацыйнай палітыкі, стымулявання занятасці і падтрымкі прадпрыемстваў.

Урадам з удзелам дэпутацкага корпуса праведзена сур'ёзная работа па карэкціроўцы Падатковага кодэкса, якая стварае добрую аснову для развіцця прадпрымальніцтва. Спрашчаюцца адміністраванне, парадак узаемадзеяння плацельшчыкаў з падатковымі органамі. Прадугледжваецца і шэраг крокаў па зніжэнні падатковай нагрузкі.

Але дэпутатам трэба бачыць перспектыву і прадаўжаць кансультацыі з прадстаўнікамі дзелавых колаў, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, грамадзянамі. Менавіта такі дыялог дае магчымасць дасягаць балансу інтарэсаў дзяржавы і бізнесу.

У канцы восені мы правядзём парламенцкія слуханні па інвестыцыйнай тэматыцы. Наша задача — не толькі забяспечыць прыняцце запатрабаваных жыццём паправак у закон «Аб інвестыцыях», але і дакладна вызначыцца з канкрэтнымі напрамкамі далейшага ўдасканалення заканадаўства ў гэтай сферы.

У цэлым жа лібералізацыя эканомікі, паляпшэнне ўмоў гаспадарання, стварэнне высокаэфектыўных рабочых месцаў і заахвочванне самазанятасці — гэта аб'ёмная, карпатлівая і комплексная работа. Большасць дакументаў, якія сёння знаходзяцца ў пастаянных камісіях (а іх ужо больш за 40), так ці інакш падпарадкаваны вырашэнню гэтых задач.

Аўтарства шасці законапраектаў належыць дэпутатам. Гэта ініцыятывы, накіраваныя на ўдасканаленне заканадаўства ў сферах інвестыцый, прыватызацыі, экалогіі і прыродакарыстання, а таксама аховы здароўя. Значны ўклад парламентарыі ўнеслі ў карэкціроўку Працоўнага і Жыллёвага кодэксаў і цэлага пакета іншых не менш значных дакументаў.

Зразумела, паспяховае вырашэнне сацыяльна-эканамічных задач шмат у чым залежыць ад міжнароднай абстаноўкі. На жаль, агульны фон тут далёкі ад пазітыву. 73-я сесія Генасамблеі ААН яскрава паказала, што сучасны свет, як трапна заўважыў яе Генеральны сакратар, мае сіндром дэфіцыту даверу.

Толькі аб'яднаўшы міжнародныя намаганні, можна забяспечыць больш справядлівае светаўладкаванне і вырашыць праблемы, якія назапасіліся. Менавіта гэта ідэя пакладзена ў аснову ініцыятывы Прэзідэнта Беларусі аб перазапуску хельсінкскага працэсу. Неабходна надаць новы імпульс агульнаеўрапейскаму дыялогу па пытаннях бяспекі, выпрацаваць комплекс мер па аднаўленні ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў свеце.

Рэалізуючы міралюбівую шматвектарную знешнюю палітыку, Беларусь паслядоўна выбудоўвае раўнапраўныя і ўзаемавыгадныя адносіны з усімі краінамі як на Усходзе, так і на Захадзе.

І наш прыклад паказвае, што адмова ад палітыкі санкцый і двайных стандартаў прыносіць відавочную выгаду ўсім удзельнікам міжнароднага дыялогу. Паляпшэнне адносін з Еўрасаюзам адкрыла новыя грані супрацоўніцтва не толькі для Беларусі, але і для нашых партнёраў.

Уносячы сур'ёзны ўклад ва ўмацаванне міжнароднай стабільнасці, Рэспубліка Беларусь мае і шэраг пераваг з пункту гледжання вядзення сумеснага бізнесу. У гэтым пераконваецца ўсё большая колькасць замежных парламентарыяў, якія наведалі нас апошнім часам.

Вынікам нашага ўзаемадзеяння сталі прыкметнае пашырэнне двухбаковых сувязяў і ўсё большая ўвага да беларускіх ініцыятыў у міжнародных і рэгіянальных парламенцкіх структурах.

Гэта адчувалася на 27-й штогадовай сесіі ПА АБСЕ, дзе была падтрымана наша рэзалюцыя па пытаннях папулярызацыі лічбавай эканомікі, у ходзе перагавораў на палях трэцяй сустрэчы спікераў парламентаў краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і 39-й Генасамблеі МПА АСЕАН, а таксама ў час візіту кіраўніцтва Лацінаамерыканскага парламента ў Мінск.

Мы вітаем цікавасць да Беларусі і гатоўнасць развіваць з намі палітычны дыялог. Але ўпэўнены, што настаў час больш рашуча арыентаваць яго на дасягненне ўзаемавыгаднага эканамічнага эфекту.

У гэтым плане парламенцкая дыпламатыя ўяўляе сабой даволі магутны рэсурс. Напрыклад, у сярэдзіне верасня ў Мінску былі падпісаны кантракты на пастаўку ў Судан 17 збожжасховішчаў на суму 60 млн еўра. А гэта прамы вынік мінулагодняга візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі ў гэту краіну.

У бягучым годзе мы актыўна кантактавалі з калегамі з Азербайджана, Арменіі, Германіі, Грузіі, Інданезіі, Ірана, Латвіі, Польшчы, Расіі і Эстоніі. Мяркую, у нашых агульных інтарэсах дабіцца рэалізацыі намечаных планаў ужо ў найбліжэйшай перспектыве.

Мы прадоўжым нарошчваць дынаміку двухбаковых кантактаў. Нашу краіну плануюць наведаць кіраўнікі парламентаў Казахстана і Егіпта. Рыхтуюцца візіты беларускіх парламентарыяў у Германію, Канаду і Кітай.

Нам ёсць што прапанаваць адно аднаму, проста трэба больш настойліва шукаць пункты прыкладання сумесных намаганняў. У гэтых мэтах трэба шырэй выкарыстоўваць магчымасці шматбаковых дыялогавых пляцовак. Гэтай восенню, напрыклад, пройдуць чарговыя мерапрыемствы парламенцкіх асамблей АБСЕ і Савета Еўропы, трэцяя нарада спікераў парламентаў краін Еўразіі і 139-я Асамблея Міжпарламенцкага саюза.

У рамках свайго ўдзелу ў гэтых форумах беларускія парламентарыі гатовы абмяркоўваць любыя тэмы па самым шырокім спектры гандлёва-эканамічных, інвестыцыйных і гуманітарных адносін.

Мы таксама вітаем ініцыятывы, накіраваныя на пашырэнне кантактаў з прадстаўнікамі дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Мінску. Мы гатовы дзяліцца сваім вопытам і ўспрымаць найлепшыя замежныя напрацоўкі. Замежныя дыпламаты павінны ведаць: дзверы Палаты прадстаўнікоў для іх заўсёды адкрыты.

Шэраг важных задач у ходзе сесіі давядзецца вырашыць у рамках Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Перш за ўсё тут трэба сканцэнтравацца на пытаннях рэалізацыі ўзгодненай прамысловай палітыкі, падрыхтоўкі праекта бюджэту Саюзнай дзяржавы на наступны год і правядзення V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Не менш сур'ёзна работу плануецца правесці па лініі парламенцкіх структур СНД і АДКБ. Дэпутатам варта больш актыўна падключацца да намаганняў урадаў па вызначэнні новых пунктаў спалучэння СНД з іншымі еўразійскімі інтэграцыйнымі праектамі і ў першую чаргу з Эканамічным поясам Шаўковага шляху.

У кастрычніку ў нас будзе яшчэ адна падстава сустрэцца са многімі нашымі замежнымі калегамі. Каманда Нацыянальнага сходу прыме ўдзел у Міжнародных парламенцкіх гульнях, якія традыцыйна праходзяць у Маскве. Гэту магчымасць таксама трэба выкарыстоўваць, каб непасрэдна, як кажуць, без гальштукаў, абмеркаваць пытанні, што наспелі.

Нефармальнае ўзаемадзеянне — гэта сур'ёзны рэсурс у навядзенні мастоў і ўмацаванні адносін. І нам трэба больш актыўна развіваць такія сувязі паміж парламентарыямі, бізнесменамі і звычайнымі грамадзянамі, тым больш што бязвізавы рэжым наведвання Беларусі здымае ўсякія бар'еры на гэтым шляху.

Народная дыпламатыя адыгрывае велізарную ролю ў развіцці прадпрымальніцтва, турызму, гандлю, культурных сувязяў. На гэты напрамак дэпутатам трэба звярнуць асаблівую ўвагу і ў выбарчых акругах.

Рэспубліка рыхтуецца прыняць II Еўрапейскія гульні. Мы павінны выкарыстаць магчымасці такога прэстыжнага спартыўнага форуму для прэзентацыі дасягненняў нашай краіны.

У значнай ступені вырашэнню гэтай задачы могуць дапамагчы грамадскія ініцыятывы, якія рэалізуюцца сёння пад знакам малой радзімы. Не толькі сталіца, але і любы населены пункт Беларусі павінны паўстаць перад нашымі гасцямі ў самым дастойным выглядзе.

У сукупнасці ўся сума невялікіх на першы погляд, але вельмі значных спраў па навядзенні парадку на зямлі здольна надаць сур'ёзны імпульс развіццю мясцовай інфраструктуры, стварэнню рабочых месцаў і падтрымцы сацыяльна слабаабароненых катэгорый насельніцтва.

Асабліва важна гэта ўлічваць пры выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы ў галіне палітыкі занятасці. У сваіх выбарчых акругах мы павінны на асаблівым кантролі трымаць пытанні дзейнасці камісій па садзейнічанні працаўладкаванню. Фармалізм у гэтай рабоце абсалютна недапушчальны. Грамадзяне павінны быць цвёрда перакананы ў тым, што ў цяжкай жыццёвай сітуацыі ім абавязкова будзе аказана дапамога.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце мне падзякаваць вам за добрую падрыхтоўку да сесіі і запрасіць да работы.

Камунальныя стасункі

# БАТАРЭІ НАГРАВАЮЦЦА

## Калі ўключаць ацяпленне, вырашаюць мясцовыя ўлады

**Амаль палова сталічных кватэр з 1 кастрычніка атрымала цяпло. Ацяпленне прыходзіць і ў мінскія інтэрнаты, гасцініцы і басейны. У Гродзенскай вобласці 42 % жылля з панядзелка знаходзіцца ў рэжыме прапальвання. Мінская вобласць за ўчора падключыла да цяпла жыллё ў чатырох раёнах. Батарэі жыхароў Магілёўшчыны пачнуць цяплець толькі сёння. А вось Брэсцкая, Віцебская, Гомельская вобласці рашэння па ацяпленні жылля не прынялі.**

Нагадаем, што ўключаць ацяпленне ў Беларусі, згодна з нормамі, пачынаюць, калі на працягу пяці дзён сярэднясутачная тэмпература не перавышае 8 градусаў. Сёлета з улікам неспрыяльных пагодных умоў, якія прагназавалі сіноптыкі, ацяпляльны сезон у Мінску вырашылі пачаць яшчэ 28 верасня. З мінулай пятніцы цяпло пачалі даваць у аб'екты сацыяльнай сферы: сталічныя дзіцячыя садкі, школы і бальніцы.

Сацыяльныя аб'екты Віцебшчыны пачалі атрымліваць цяпло таксама з 28 верасня. У Гомельскай вобласці, Крупках, Жодзіне, Смалявічах і Вілейцы ацяпляльны сезон стартаваў 29 верасня. На наступны дзень пачало цяплець у Мінскім раёне. Гродзенская вобласць падцягнулася 1 кастрычніка, Магілёўская і Брэсцкая — 2 кастрычніка. Учора ў пяць гадзін вечара непадключанымі да цяпла заставаліся сацыяльныя аб'екты ў двух раёнах Магілёўскай вобласці, дзевяці раёнах Брэсцкай і чатырох раёнах Мінскай вобласці.

— Пачатак падключэння ацяплення цалкам залежыць ад мясцовых улад. Калі яны бачаць, што сітуацыя з надвор'ем складаная, павінны прымаць адпаведнае рашэнне. Перад мінулымі выхаднымі абяцалі рэзкае паніжэнне тэмпературы, таму пачынаць ацяпляльны сезон было проста неабходна. Гэта не толькі камфорт пражывання людзей, але і бяспека саміх жылых дамоў, — мяркуе **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, прэс-сакратар Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

На працягу пяці дзён батарэі павінны стаць цёплымі ва ўсіх сталічных кватэрах. Холадна будзе толькі там, дзе спатрэбяцца работы па распаветрыванні і наладцы сістэмы ацяплення. На гэта камунальнікам даецца да 10 дзён.

— Можа здарыцца, што цяпло ў доме ўключылі, а ў пэўных кватэрах яго не будзе. Магчыма, запаветрылася сістэма або ёсць нейкія гідраўлічныя праблемы, якія трэба ліквідаваць. Для такіх жыхароў і ацяпляльны сезон, і аплата за ацяпленне пачнецца з дня падачы цяпла ў іх памяшканні, а не ў дом, — растлумачыў прадстаўнік ЖКГ. — Дамавы прыбор уліку, які падлічвае, колькі цяпла падаецца на жылы дом, пры адсутнасці ацяплення ў адной ці некалькіх кватэрах налічыць, вядома, менш. А памер колькасці цяпла, якая прыходзіцца на кожную кватэру, будзе разлічвацца з улікам дня падключэння ацяплення ў пэўным памяшканні. Кватэрам, дзе не было цяпла, зробяць перараслік налічэнняў за ацяпленне зыходзячы з даты, калі жыллё стала сапраўды абагравацца.

У міністэрстве дадалі, што пакуль інфармацыі пра праблемы пры падключэнні ацяплення ім не паступала. Даведацца, калі ў дом прыйдзе цяпло, жыхары могуць у рэжыме анлайн пры дапамозе чат-бота. Летась у аб'ектах сацыяльнай сферы Мінска ацяпленне пачалося з 3 кастрычніка, а ў жыллі — з 6-га.

**Ірына СІДАРОК.**

# ГОНАР НАШАГА СПОРТУ

**Дванаццаць медалёў, тры з якіх залатыя, прывезлі шашысты Беларусі з чэмпіянату Еўропы**

**З 15 па 23 верасня ў курортным мястэчку Кранева ў Балгарыі прайшоў асабіста-камандны чэмпіянат Еўропы па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. Нашу краіну на першынстве кантынента прадставілі чацвёра міжнародных грасмайстраў: Андрэй Валюк, Яўген Кандрачэнка, Ігар Міхальчанка і Дар'я Федаровіч. Таксама выступілі моцныя міжнародныя майстры Вера Хвашчынская, Анастасія Барышава і Сяргей Садоўскі.**

У «бліцы» беларусы заваявалі тры медалі: Дар'я Федаровіч стала сярэбраным прызёрам, а вось Андрэй Валюк і Вера Хвашчынская сталі ўладальнікамі бронзавых медалёў. У «рапідзе», а менавіта ў «бразільскай версіі», увесь п'едэстал аказаўся беларускім: у мужчынскім турніры Ігар Міхальчанка стаў чэмпіёнам Еўропы, Яўген Кандрачэнка — сярэбраным прызёрам, а Андрэй Валюк заваяваў бронзавы медаль.

У жаночым турніры ў «рапідзе» Вера Хвашчынская стала сярэбраным прызёрам, а Дар'я Федаровіч заваявала бронзавую ўзнагароду. У асноўнай «класічнай версіі» чэмпіёнкай Еўропы стала шашыстка з Бабруйска Вера Хвашчынская, якая ў фінальнай барацьбе адолела леташнюю чэмпіёнку свету і Еўропы Алену Скавіціну з Малдавіі. Такім чынам, Вера Хвашчынская сабрала поўны камплект медалёў і атрымала званне міжнароднага грасмайстра, да якога ўпэўнена ішла. Анастасія Барышава ў «класіцы» заваявала бронзавы медаль, абыграўшы яшчэ адну беларуску, Дар'ю Федаровіч. У мужчынскім фінале гулялі абодва беларусы Ігар Міхальчанка і Андрэй Валюк. Першы ўсё ж вырваў перамогу толькі ў трэцім фінальным матчы са скарочаным рэгламентам.

У агульнакамандным заліку каманда Беларусі ўжо трэці раз становіцца найлепшай у свеце і Еўропе.

**Яўген САЛАНОВІЧ, майстар спорту СССР па міжнародных і рускіх шашках.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У свеце больш давяраюць Меркель

У сувязі з палітыкай прэзідэнта ЗША Дональда Трампа імідж яго краіны ў свеце значна пагоршыўся. Да такой высновы прыйшлі эксперты амерыканскага Pew Research Center.

Даследаванне Pew Research праводзілася ў 25 краінах Еўропы, Азіі, Лацінскай Амерыкі, Расіі і Ізраілі. Яно было прымеркавана да двухгадовай гадавіны абрання прэзідэнтам ЗША Дональда Трампа.

На думку рэспандэнтаў, Трамп менш здольны эфектыўна кіраваць краінай, чым Уладзімір Пуцін ці Сі Цзіньпін. У сувязі з палітыкай, якую праводзіць цяперашняя адміністрацыя прэзідэнта, знізілася і доля людзей, якія добразычліва ставяцца да ЗША. Асабліва моцна розніца прыкметная на прыкладзе ўдзельнікаў апытання з Германіі. Калі пад канец прэзідэнцкага тэрміну Барака Абамы 57 працэнтаў немцаў з адабрэннем ставіліся да Злучаных Штатаў, то ў 2018 годзе такіх засталося ўсяго 30 працэнтаў. Што да самога Трампа, то яму давяраюць толькі 10 працэнтаў рэспандэнтаў з Германіі. У сваю чаргу, імідж ЗША застаецца высокім у Філіпінах, Ізраілі і Паўднёвай Карэі — у гэтых дзяржавах пра Злучаныя Штаты станоўча адазваліся больш за 80 працэнтаў рэспандэнтаў. Адзіным лідарам, якому давяраюць больш за палову апытаных, стала канцлер ФРГ Ангела Меркель: яе дзейнасць станоўча ацанілі 52 працэнты рэспандэнтаў.

## Тэрэза Мэй не пагадзілася са словамі кіраўніка брытанскага МЗС, які параўнаў ЕС з СССР

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй не пагадзілася з ацэнкамі свайго міністра замежных спраў Джэрэмі Ханта, які ў сваім апошнім выступленні параўнаў Еўрасаюз з СССР. Раніцай 2 кастрычніка ў інтэрв'ю вяшчальнай карпарацыі Бі-бі-сі Мэй падкрэсліла, што, згодна з яе назіраннямі, паміж двума саюзамі мала агульнага.

«Я сяджу за круглым сталом ЕС разам з прадстаўнікамі краін, якія былі часткай Савецкага Саюза, аднак зараз з'яўляюцца дэмакратычнымі дзяржавамі. Магу сказаць вам, што гэтыя дзве арганізацыі — зусім не адно і тое ж», — сказала Мэй.

У сваёй прамове на з'ездзе кіруючай Кансерватыўнай партыі ў Бірмінгеме Хант абвінаваціў Еўрасаюз у тым, што ён ператвараецца з клуба ў турму, не даючы Вялікабрытаніі пакінуць супольнасць на тых умовах, якія прапануе Лондан. Паводле яго слоў, ствараючы перашкоды для краін, якія хочуць выйсці з ЕС, Брусель паўтарае памылкі СССР і толькі ўзмоцніць цэнтрабежныя тэндэнцыі ўнутры супольнасці.

Па словах Тэрэзы Мэй, нягледзячы на тое, што перагаворы Вялікабрытаніі з ЕС цяпер знаходзяцца ў тупіку, яе кабінет не мае намеру адступаць ад займаных пазіцый.

## Кіраўнік МЗС Грэцыі: самым дрэнным сцэнарыем для Рэспублікі Македонія быў бы яе развал

Развал Рэспублікі Македонія быў бы найгоршым сцэнарыем развіцця падзей у гэтай краіне, калі б там узнікла нестабільнасць. З такой ацэнкай выступіў міністр замежных спраў Грэцыі Нікас Катзіяс у інтэрв'ю, якое ён даў грэчаскаму тэлеканалу ERT у сувязі з рэферэндумам аб змене назвы былой югаслаўскай рэспублікі, які там адбыўся ў нядзелю.

«Былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія (БЮРМ) без стабільнасці і згуртаванасці грамадства можа разваліцца, і гэта было б найгоршым сцэнарыем для падзей у балканскім рэгіёне», — сказаў Катзіяс. «Супрацоўніцтва паміж Грэцыяй і БЮРМ з'яўляецца найлепшай палітыкай для будучага Балкан», — дадаў міністр, высока ацаніўшы «стабілізуючую ролю Грэцыі ў рэгіёне».

Каментуючы пазіцыю македонскіх апазіцыйных партый, якія заклікалі да байкоту рэферэндуму, грэчаскі міністр сказаў, што яны аддалі перавагу таму, каб устрымацца ад галасавання, бо «ў адваротным выпадку пацярпелі б фіяска».

Бяспечнае асяроддзе

# ЗНІШЧЫЦЬ... АДХОДЫ

**Пры фінансавай падтрымцы Глабальнага экалагічнага фонду ў краіне плануецца ажыццявіць два буйныя праекты па кіраванні небяспечнымі рэчывамі (адходамі). На іх рэалізацыю ГЭФ выдзеліў Беларусі больш за 12 млн долараў ЗША.**

— Экалагічна бяспечнае абясшкоджванне небяспечных адходаў, у тым ліку тых, якія змяшчаюць стойкія арганічныя забруджвальнікі (непрыдатныя пестыцыды, ПХБ-змяшчальнае абсталяванне і інш.), — адна з найбольш вострых праблем у сферы рэгулявання абыходжання з адходамі. Для яе вырашэння ў нашай краіне вельмі важна стварыць аб'ект па абясшкоджванні (знішчэнні) небяспечных адходаў, у тым ліку САЗ, здольны забяспечыць абясшкоджванне тых аб'ёмаў небяспечных адходаў, якія ўжо ёсць, і тых, якія штогод утвараюцца, — расказалі ў прэс-службе Мінпрыроды.

Менавіта на гэтыя мэты і накіраваныя праекты «Устойлівае кіраванне стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і хімічнымі рэчывамі ў Рэспубліцы Беларусь, ГЭФ-6» і «Узгодненае кіраванне ўтылізацыяй азонаразбуральных рэчываў (АРР) і стойкіх арганічных забруджвальнікаў (САЗ) у Беларусі, Украіне, Казахстане і Арменіі (рэгіянальны дэманстрацыйны праект)», якія плануецца рэалізаваць.

Асноўным з мерапрыемстваў праектаў стане закупка абсталявання і стварэнне аб'екта экалагічна бяспечнага знішчэння САЗ і іншых небяспечных адходаў у аб'ёме да 2 тысяч тон у год на базе КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці». На гэтыя мэты плануецца накіраваць больш за 3 млн долараў ЗША. Увод у эксплуатацыю дадзенага аб'екта ў Чачэрскім раёне дазволіць у перспектыве знішчыць адходы, якія захоўваюцца як у падземных сховішчах непрыдатных пестыцыдаў, так і на самім прадпрыемстве, дзе ўжо назапашана больш за 4 тысячы тон небяспечных адходаў.

— Наша задача — на працягу трох гадоў запусціць гэта прадпрыемства. Я думаю, у першай палове наступнага года мы закупім абсталяванне і пачнём будаўніцтва, — адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** у эфіры праграмы «Тыдзень» на канале СТБ.

Плануецца, што з дапамогай вышэйназваных праектаў да 2022 года ў краіне будзе знішчана каля 2370 тон адходаў ПХБ, ці 63 % ад агульнай колькасці тых, якія маюцца ў рэспубліцы. Да гэтага ж часу мусіць быць знішчана і каля 1900 тон непрыдатных пестыцыдаў і забяспечана ліквідацыя 100 % складоў гэтых адходаў, якія належаць сельгаспрадпрыемствам. Спецыялісты збіраюцца правесці дэтальнае абследаванне пяці падземных сховішчаў непрыдатных пестыцыдаў. Акрамя таго, набыццё аналітычнага абсталявання для Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў сферы аховы навакольнага асяроддзя ў спалучэнні з распрацоўкай сістэмы выяўлення і рэгістрацыі зямель, забруджаных хімічнымі рэчывамі, і яе інтэграцыяй у структуру Геапартала зямельна-інфармацыйнай сістэмы Рэспублікі Беларусь (ЗІС), удасканаленнем праграмы маніторынга САЗ і нарматыўна-метадычнай базы правядзення назіранняў дазволіць палепшыць якасць збору і падачы маніторынгавай інфармацыі пра забруджванне САЗ, адзначылі ў прыродаахоўным ведамстве.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Сугучча

# Беларускія акцэнты ў Каракумскім краі

**Учора, 2 кастрычніка, у сталіцы Туркменістана адкрылася XII Ашхабадская міжнародная выстаўка-кірмаш. Удзел у прэстыжным цэнтральнаазіяцкім кніжным форуме прымаюць шэсць беларускіх выдавецтваў і гандлёвае прадпрыемства «Белкніга».**

Беларускі стэнд — адзін з самых наведвальных. У адкрыцці экспазіцыі нашай краіны актыўны ўдзел прынялі туркменскія выдаўцы і пісьменнікі, з якімі ў апошні час наладжаны досыць добрыя сувязі. Як і складваюцца добрыя сувязі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Туркменскай дзяржаўнай выдавецкай службы. **Кіраўнік беларускай дэлегацыі дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК** адзначае, што тэмай для двухбаковых зносін маглі б стаць новыя праекты, звязаныя з выданнем адукацыйнай літаратуры, з прадстаўленнем таксама тых кніжных навінак, якія расказваюць пра турыстычны патэнцыял нашых краін. Нельга не ўлічваць тое, што ў Беларусі вучыцца каля дзесяці тысяч студэнтаў з Туркменістана. І невыпадкова менавіта ў Туркменістане з прадпрыемствам «Туркменкітаб» абмяркоўваецца пытанне аб насычэнні будучай мінскай кнігарні «Дружба» (яе адкрыццё плануецца да канца 2019 года) літаратурай, якая выдадзена на туркменскай мове.

— У нас склаліся добрыя адносіны з калегамі з рэдакцый беларускіх літаратурна-мастацкіх выданняў, Выдавецкім домам «Звязда», — заўважыла на адкрыцці беларускага стэнда **адказны сакратар часопіса «Гарагум» празаік і перакладчык Бягуль АНАБАЕВА.** — Мы ўжо друкавалі ў перакладзе на туркменскую мову творы Сяргея Трахімёнка, Ірыны Карнаухавай, Таццяны Сівец і іншых літаратараў з Беларусі. Ведаю, што пісьменнікі вашай краіны — частыя госці на старонках часопіса «Дунья эдэбіяты» («Сусветная літаратура») і газеты «Эдэбіят ве сунгат» («Літаратура і мастацтва»).

Кніжная выстаўка ў Ашхабадзе працягваецца. Будзем спадзявацца і на яе плён у плане развіцця добрых адносін паміж Туркменістанам і Беларуссю.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Дыпламатычнае інтэрв'ю

## Сангіта БАХАДУР:

# «Мільярд долараў тавараабароту можа стаць рэальным»

**Фармат камунікацыі паміж Беларуссю і Індыяй, калі азірнуцца на больш чым 25 гадоў дыпламатычных адносін, выглядае больш сяброўствам, чым міждзяржаўным супрацоўніцтвам. Нашы краіны перыядычна «заступаюцца» адна за адну на міжнародных пляцоўках: Індыя падтрымлівае ўступленне Беларусі ў СГА, Беларусь выступала за ўваходжанне Індыі ў склад непастаянных членаў Савета Бяспекі ААН, мы ніколі не чулі крытыкі з боку Індыі, афіцыйныя асобы часта наносяць двухбаковыя візіты. Пры гэтым гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва выглядае даволі сціплым. Мы сустрэліся з паслом Індыі ў Беларусі Сангітай БАХАДУР, каб пагаварыць пра сяброўства, супрацоўніцтва і бізнес паміж нашымі краінамі і ў першую чаргу спыталі, ці здольная цеплыня ў нашых адносінах паспрыяць дасягненню стратэгічных дамоўленасцяў.**

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— Сапраўды, паміж намі няма палітычных праблем. Мы не толькі падтрымліваем адно аднаго на міжнароднай арэне і абменьваемся візітамі на высокім узроўні, але і супрацоўнічаем у абароне, навуцы, тэхналогіях, — адзначае спадарыня пасол. — Вы правільна кажаце, добрыя адносіны пакуль не моцна ўплываюць на нашы гандлёвыя паказчыкі, але я хацела б адзначыць, што, нягледзячы на пэўныя ўзлёты і падзенні, аб'ём гандлю ніколі моцна не падаў. Я глядзела лічбы тавараабароту апошніх гадоў — яны трымаюцца ў межах паміж 400 і 500 мільёнамі долараў у год. У 2016 і 2017 гадах тавараабарот быў прыблізна 406 і 454 мільёны долараў адпаведна, а за першыя шэсць месяцаў 2018-га мы ўжо перавысілі 260 мільёнаў долараў, гэта значыць, калі так будзе працягвацца, вынікі года будуць яшчэ лепшыя. Вы ўжо ведаеце, што мы хочам паспрабаваць павялічыць гэтую лічбу да мільярда долараў у год, у чым зацікаўлены абодва ўрады, і я адчуваю, тут няма нічога немагчымага. Усё больш і больш людзей з абодвух бакоў праяўляюць да гэтага вялікі інтарэс, шмат дэлегацый прыязджае з Індыі ў Беларусь, мы выдаём візы беларускім бізнесменам і супрацоўнікам арганізацый, якія ўдзельнічаюць у міжнародных форумах і ўсталёўваюць адносіны з бізнес-партнёрамі ў Індыі. Мільярд долараў тавараабароту не будзе дасягнуты, як планавалася, у гэтым годзе, але ён можа стаць рэальным у найбліжэйшыя некалькі гадоў.

***— За кошт чаго мы маглі б дасягнуць такіх гандлёвых паказчыкаў?***

— На маю думку, тут важныя некалькі фактараў. Па-першае, мне здаецца, мы занадта сфакусаваны на абмежаванай колькасці сфер, дзе супрацоўніцтва ўжо наладжана. Напрыклад, Індыя ў асноўным імпартуе з Беларусі ўгнаенні і некалькі іншых пазіцый, а Беларусь з Індыі — медыцынскія прэпараты і нешта яшчэ. Пакуль мы не знойдзем новыя сферы для супрацоўніцтва, рост гандлю, вядома ж, будзе марудны. Мы ўжо пачынаем думаць пра гандаль не проста пэўнымі таварамі, а паслугамі, пра абмен у сферах IT, аховы здароўя і разумных тэхналогій. Індыя сёння будуе каля сотні разумных гарадоў — Беларусь магла б забяспечыць іх тэхналагічнай падтрымкай, што стала б істотнай сферай экспарту паслуг у Індыю. Гэтаксама з індыйскага боку: можна падумаць пра тэхналогіі ў энергаздабычы, транспарт і шмат іншых рэчаў. Мы павінны адысці ад традыцыйнага шэрагу тавараў, якімі мы абменьваемся, і, па-першае, пашырыць яго, па-другое, што вельмі важна, звярнуць увагу на сферу паслуг і, па-трэцяе, стварыць сумесныя прадпрыемствы для экспарту прадукцыі ў трэція краіны.

***— Наколькі Беларусь увогуле прыцягальная для індыйскіх інвестыцый?***

— Бізнес у Індыі ў асноўным знаходзіцца ў прыватных руках. Таму ён гатовы працаваць з іншымі краінамі, калі адчувае бяспеку і мае магчымасць атрымаць добры прыбытак, гэта значыць бачыць, што рынак дастаткова вялікі. Бяспека для замежных інвестыцый — адказнасць беларускага ўрада. Што датычыцца рынку, тут ёсць складанасць: Беларусь — маленькі рынак, насельніцтва ўсёй краіны роўнае прыкладна палове насельніцтва толькі Нью-Дэлі. Індыйскім бізнесменам, каб прыйсці сюды, трэба разумець, што гэты рынак можа быць большым, і я заўсёды імкнуся падкрэсліваць, што сапраўды можа, бо Беларусь варта ўспрымаць не як асобную краіну, а як частку ЕАЭС, як краіну з добрай геаграфічнай пазіцыяй, што дазваляе звязвацца з Усходняй і Заходняй Еўропай. Індыйскі бізнес пачынае гэта разумець, хаця тут і не хапае камунікацыі і інфармавання. Думаю, калі гэтыя акалічнасці стануць вядомымі большай колькасці людзей з бізнес-сферы, аб'ём гандлю павялічыцца. Гэтаксама з пункту гледжання беларускага боку: Індыя — проста агромністы рынак, сярэдні клас Індыі па колькасці перавышае цэлую Еўропу, трэба толькі ўсвядоміць патэнцыял гэтай тэрыторыі, тут можна прадаваць усё — ад прадуктаў да паслуг і тэхналогій. Магу прывесці ў прыклад малочную вытворчасць: Індыя не здольна забяспечыць сваю патрэбу ў малочных прадуктах, таму імпартуе іх, напрыклад, з Даніі ці Вялікабрытаніі. Чаму не з Беларусі? У вас цудоўная малочная індустрыя, чаму б не прасоўваць яе ў Індыі? Беларускі бізнес павінен ведаць, што няма такіх рэчаў, якія там нельга прадаць: Індыя імкліва развіваецца і адпаведна павялічвае аб'ём спажывання. Чаму б Беларусі не вызначыць для сябе некалькі сфер з вялікім патэнцыялам, у якіх мы маглі б плённа супрацоўнічаць? Як малочная прадукцыя, інфраструктура, разумныя тэхналогіі. У Беларусі ёсць кампанія SkyWay, што займаецца транспартнымі сістэмамі і мае вялікі патэнцыял у Індыі. Некалькі гадоў таму яны спрабавалі ўвайсці на індыйскі рынак, але — я не ведаю, што здарылася, — перанакіравалі сваю ўвагу на іншыя краіны, асабліва, напэўна, на Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, у прыватнасці Дубай. Усё ў парадку, але Дубай — невялікі горад, а патэнцыял Індыі — бясконцы і з ім нарэшце трэба працаваць, немагчыма, каб яно не спрацавала, проста на гэта патрэбны час і высілкі. Я разумею, камунікацыі паміж нашымі краінамі часам перашкаджае культурная адрозненасць, але я яшчэ раз падкрэслю: магчымасці для нашага супрацоўніцтва агромністыя, асабліва для беларусаў у Індыі.

***— А як наша культурная адрозненасць можа перашкодзіць супрацы?***

— Я прывяду некалькі прыкладаў. Адна беларуская кампанія спрабавала наладзіць бізнес у Індыі, яе прадстаўнік сказаў мне, што адзінае слова, якое вы ніколі не пачуеце ў Індыі, — «не». Гэта праўда, індыйцы вельмі ветлівыя і ніколі не кажуць «не», але трэба разумець, што іх «так» можа значыць «так», «магчыма» і «не, я не зацікаўлены». У Індыі першае, што ты павінен зрабіць для бізнес-партнёрства, — усталяваць асабістыя стасункі. Еўрапейцаў гэта вельмі здзіўляе, для іх бізнес ёсць бізнес, навошта станавіцца добрымі сябрамі, каб стаць бізнес-партнёрамі. Да таго ж індыйскі калега можа сказаць: «Я зраблю гэта праз два дні». Але трэба разумець, што два дні звычайна азначаюць два месяцы. Напрыклад, японцы — японскага бізнесу шмат у Індыі — перад тым як прыняць праект, старанна вывучаюць кожную дэталь, ім можа спатрэбіцца шэсць месяцаў, а тым часам нехта іншы прыйдзе і зойме нішу. Такога роду культурныя асаблівасці — тое, як ты размаўляеш, узаемадзейнічаеш, працуеш — вельмі важныя. Часам відаць, што замежнікі не разумеюць, як працаваць у Індыі, таму нават шматабяцальныя праекты могуць не здзейсніцца.

**«Беларусь — усё яшчэ не даследаваны рынак для індыйскага бізнесу».**

***— Вы сказалі, бізнес павінен адчуваць бяспеку для сваіх інвестыцый. Ці адчувае гэта індыйскі бізнес у дачыненні да Беларусі? Падчас візіту ў Індыю ў мінулым годзе наш Прэзідэнт сказаў пра спецыяльныя ўмовы для індыйскіх інвестыцый.***

— Я думаю, мелася на ўвазе асаблівая эканамічная зона «Брэміна-Орша», куды прыходзіць індыйскі бізнес, я і сама расказваю кампаніям у Індыі, як імкліва яна развіваецца, хаця інфраструктура вакол яе прагрэсуе марудней, чым хацелася б. Што датычыцца спецыяльных умоў для індыйскіх інвестараў, я думаю, беларускі ўрад павінен даць зразумець, што «ён не проста сардэчна запрашае ў Беларусь, а запрашае застацца тут на доўгі час». Для бізнесу гэты сігнал пакуль не вельмі зразумелы, людзі не ўпэўнены, што, калі пачнуць тут сваю справу і дасягнуць пэўнага ўзроўню, не сустрэнуцца з непрадбачанымі складанасцямі. Людзі займаюцца бізнесам дзеля грошай, гэта відавочна, так што, калі яны не ўпэўнены, што атрымаюць асалоду ад вынікаў іх высілкаў, то некалькі разоў падумаюць, перш чым адкрываць для сябе новую тэрыторыю.

***— Як вядома, паміж Індыяй і ЕАЭС вядуцца перагаворы аб стварэнні зоны свабоднага гандлю. Ці не пацерпяць інтарэсы Беларусі, калі пагадненне будзе падпісана?***

— Мы вельмі ўдзячныя Беларусі за дапамогу, бо менавіта Беларусь ініцыявала гэтыя перагаворы. Па некаторых прычынах мы пакуль не можам падпісаць дакументы, але патрэбных дамоўленасцяў мы дасягнём вельмі хутка. Відавочна, гэта мусіць прынесці добры прыбытак як Індыі, так і ЕАЭС, які ўключае ў сябе Беларусь. Я думаю, гэта будзе мець добрае ўздзеянне на эканамічныя адносіны паміж Індыяй і Беларуссю з-за адмены падатковых абмежаванняў ці абмежаванняў аб'ёму тавару, у выніку паток тавараў і паслуг паміж нашымі краінамі вырасце. Больш за тое, думаю, якраз з падпісаннем пагаднення аб стварэнні зоны свабоднага гандлю паміж Індыяй і ЕАЭС мы будзем здольныя дасягнуць з Беларуссю мільярднага тавараабароту. Пэўныя сумненні пра негатыўны ўплыў пагаднення ўзнікаюць, таму што Беларусь — усё яшчэ не даследаваны рынак для індыйскага бізнесу, гэтаксама і Беларусь не адкрыла для сябе індыйскі рынак. Але, я думаю, з адменай бар'ераў гандаль паміж намі стане больш інтэнсіўным.

***— Самая буйная сфера супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі — фармацэўтыка. Не так даўно стала вядома, што індыйская фармацэўтычная кампанія збіраецца інвеставаць мільён долараў у навукова-тэхналагічны цэнтр па вытворчасці лекаў у Беларусі. Такога роду супрацоўніцтва — гэта заўсёды абмен сваімі моцнымі бакамі. Што ў гэтай сферы Беларусь запазычвае ў Індыі і што цікава запазычыць вашаму боку?***

— Так, гэта буйная індыйская кампанія Cipla Limited. Не так даўно яна заклала камень у будучы навукова-даследчы цэнтр у Беларусі і сапраўды збіраецца ўкласці ў яго мільён долараў. Фармацэўтыка — традыцыйны сектар супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, прычым тут магчымы вялікі рост. Мы спадзяемся, больш індыйскіх кампаній будзе далучацца да фармацэўтычнай вытворчасці ў Беларусі, ствараць і прадаваць медыцынскія прэпараты, якія мы маглі б экспартаваць ва Усходнюю і Заходнюю Еўропу, Азію. Тут ёсць патэнцыял, але мы таксама шукаем іншыя сферы для сумеснай вытворчасці, тут можа быць усё, што заўгодна, беларускія кампаніі ў Індыі ўжо ўдзельнічаюць у горназдабычы, вытворчасці нафтапрадуктаў і абарончай тэхнікі, у сферы IT, напрыклад EPAM ёсць у Індыі. Мы толькі павінны вызначыць, у чым можам супрацоўнічаць і дзе наладжваць вытворчасць. Напрыклад, фармацэўтычныя кампаніі прыходзяць у Беларусь, таму што разлічваюць на гэты рынак.

***— Што яшчэ на парадку дня, дык гэта зацікаўленасць Беларусі ў турыстах з Індыі. Чым мы маглі б прыцягнуць іх увагу?***

— Вельмі добрым пачаткам стала рашэнне аб адмене віз: замежнікі з шэрагу краін могуць прысутнічаць у Беларусі без візы цягам трыццаці дзён, а Індыя — адна з гэтых краін. Другая рэч, якая мне падаецца вельмі важнай, — прамыя авіярэйсы. Цяпер іх няма, хаця адлегласць паміж нашымі краінамі не такая вялікая, палёт можа заняць шэсць гадзін, а з перасадкамі мы павінны ляцець дванаццаць і больш. Трэба вырашыць, як зрабіць падарожжа з Індыі ў Беларусь больш камфортным. Таксама беларускае пасольства павінна паклапаціцца аб прыцягальным вобразе Беларусі, прынамсі, расказаць пра сваю краіну, бо дагэтуль шмат людзей асацыюць Беларусь з Савецкім Саюзам, а нехта нават не ведае, дзе яна знаходзіцца. Для мяне гэта вельмі прыгожая і прыцягальная краіна з цудоўным кліматам і вельмі прыязнымі людзьмі, чысты, зялёны і прыгожы Мінск. Няма ніводнай прычыны, чаму б індыйскія турысты адмовіліся сюды прыехаць, але мы павінны пакласці Беларусь на карту іх інтарэсаў, бо індыйцы падарожнічаюць паўсюль і ўвесь час шукаюць новыя месцы. У прасоўванні беларускага кірунку трэба задзейнічаць індыйскія турыстычныя агенцтвы. Я заўважыла, што большасць з іх накіравана на Заходнюю Еўропу, але чаму не паказаць і гэтую частку Еўропы? Яшчэ адным прыгожым спосабам зацікавіць індыйскіх турыстаў можа стаць запрашэнне балівудскай кінаіндустрыі, каб тут здымаліся фільмы. Вы ведаеце, балівудскае кіно вельмі папулярнае ў Індыі, і калі гледачы ўбачаць на экране прыгожыя лакацыі, вашы азёры і Мінск, яны будуць шчаслівыя паглядзець на ўсё гэта ўжывую. Шмат краін ужо ажыццявіла такі сцэнарый, але для гэтага беларускі ўрад павінен прапанаваць кінапрадзюсарам асаблівыя ўмовы.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Эканамічны расклад

# ПЛАН НА ШАСЦІГОДКУ

**Заработная плата педагагічных работнікаў да 2025 года павінна павялічыцца ўдвая. Пра гэта на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню настаўніка, паведаміла начальнік аддзела аплаты працы і нармавання штатнай колькасці галоўнага ўпраўлення эканомікі адукацыі Міністэрства адукацыі Наталля КРЫВАЛАПАВА.**

За восем месяцаў бягучага года сярэдняя заработная плата педагагічных работнікаў у краіне раўнялася 714,2 рубля, што складае 77 % ад сярэдняй зарплаты па краіне. Сярэдні заробак настаўнікаў склаў 759,4 рубля (81,8 % ад сярэдняй зарплаты па краіне).

— У мэтах выканання даручэнняў Прэзідэнта ўжо з 1 верасня гэтага года ўсім педагагічным работнікам, у тым ліку і настаўнікам, установлена павышэнне тарыфных акладаў у памеры 20 %. Гэта дазволіла павялічыць сярэднюю заработную плату настаўніка ў сярэднім на 42 рублі, або на 8,9 %, — паведаміла Наталля Крывалапава. — З 1 кастрычніка ў сувязі з павелічэннем тарыфнай стаўкі першага разраду да 35,5 рубля заработная плата педагагічных работнікаў і настаўнікаў павялічылася ў сярэднім на 22,7 рубля, або на 4,4 %,

Павышэнне заробкаў працягнецца і ў 2019 годзе. «Ва ўрадзе зараз разглядаецца праект аб паэтапным павышэнні заработнай платы педагагічных работнікаў, які расцягнецца на шэсць гадоў, — праінфармавала спецыяліст. — Адзін з этапаў павышэння запланаваны на 2019 год — ён прадугледжвае ўстанаўленне галіновых павышэнняў педагагічным работнікам. Аднак аб канкрэтных памерах казаць пакуль рана».

Фота БелТА.

Таксама плануецца, што **з 1 студзеня 2019 года ўсе ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ў краіне пяройдуць на новы метад фінансавання: яны будуць атрымліваць фінансаванне па нарматыве з разліку на аднаго вучня.** Спецыяліст міністэрства запэўнівае, што так будзе забяспечана справядлівасць і празрыстасць фінансавання.

— Кожная школа атрымае бюджэтныя сродкі па нарматыве ў залежнасці ад колькасці навучэнцаў у ёй. Зараз у нас дзейнічае каштарыснае фінансаванне: разлік заробку адштурхоўваецца ад колькасці класаў у школе і ніяк не залежыць ад колькасці навучэнцаў у іх, а ў класе можа быць і 30, і 15, і 5 чалавек, — падкрэслівае Наталля Крывалапава. — Фінансаванне, якое залежыць ад колькасці вучняў, паставіць усе ўстановы адукацыі ў роўныя ўмовы.

Зараз у Беларусі працуе 3038 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі (школы, гімназіі, ліцэі), у якіх налічваецца больш за 1 мільён навучэнцаў. Адукацыйны працэс забяспечваюць каля 119 тысяч педагагічных работнікаў, у тым ліку каля 99 тысяч настаўнікаў. Да працы з 15 жніўня ва ўстановах адукацыі прыступілі больш за 4,6 тысячы маладых спецыялістаў.

Рэйтынгі

# «Дарожная карта» ў найвышэйшую лігу

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт адзіны з айчынных ВНУ ўстойліва ўваходзіць у рэйтынг Times Higher Education (THE). Паводле апошняй рэдакцыі THE, БДУ знаходзіцца ў групе 1001+. А ўсяго ў рэйтынг трапілі 1258 найлепшых універсітэтаў свету.**

THE — адзін з найбольш аўтарытэтных і прэстыжных рэйтынгаў, які ранжыруе толькі «найвышэйшую лігу» — каля 3 % усіх універсітэтаў свету, апрацоўваючы інфармацыю па кожнай ВНУ ўручную. Рэйтынг THE рыхтуецца вядомым брытанскім часопісам Times Higher Education, які спецыялізуецца на пытаннях сферы вышэйшай адукацыі. Для ранжыравання ўніверсітэтаў прымяняюцца пяць груп крытэрыяў: навуковыя даследаванні (30 %), частата цытавання (30 %), адукацыйная дзейнасць (30 %), міжнароднае супрацоўніцтва (7,5 %) і даходы ад уласнай вытворчасці (2,5 %). Як відаць, у формуле рэйтынга асноўную вагу маюць індыкатары, заснаваныя на аналізе публікацыйнай і даследчай дзейнасці ВНУ. Неабходная ўмова для ўключэння ўніверсітэта ў рэйтынг — публікацыя за апошнія пяць гадоў супрацоўнікамі ВНУ больш як тысячы навуковых работ, якія індэксуюцца базай даных Scopus.

Канкурэнцыя паміж універсітэтамі расце: сёлета рэйтынг ахапіў 1258 ВНУ, а ў 2015 годзе іх было 800. Самую вялікую дынаміку дэманструюць краіны Азіі і Паўночнай Амерыкі, дзе акадэмічныя ўніверсітэты ў супрацоўніцтве з сусветнымі карпарацыямі ўяўляюць сабой магутныя навуковыя цэнтры. У шэрагу краін на развіццё навуковых даследаванняў ва ўніверсітэтах дзяржава выдзяляе дадатковае фінансаванне і стымулюе публікацыйную актыўнасць кожнага аўтара.

Пры колькасным павелічэнні ранжыраваных ВНУ і жорсткіх умовах адбору БДУ стабільна ўваходзіць у рэйтынг THE. Для захавання і паляпшэння сваіх пазіцый у міжнародных рэйтынгах ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі БДУ рэалізуе доўгатэрміновую «дарожную карту». Яна ўключае комплекс мерапрыемстваў па аказанні метадычнай і арганізацыйнай дапамогі выкладчыкам, навуковым супрацоўнікам, аспірантам і магістрантам пры падрыхтоўцы і публікацыі навуковых артыкулаў у вядучых замежных часопісах, а таксама прадугледжвае матэрыяльнае заахвочванне аўтараў за публікацыйную актыўнасць у часопісах, уключаных у базу даных Scopus.

Зараз на верхнім радку рэйтынга THE размясціліся ўніверсітэты Оксфарда, Кембрыджа і Стэнфарда. З краін — суседзяў Беларусі ў рэйтынгу найлепшыя пазіцыі ў расійскіх універсітэтаў. З 35 расійскіх ВНУ, уключаных у гэты рэйтынг, найбольш высокія месцы занялі Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт (199-я пазіцыя), МФТІ (251—300) і Вышэйшая школа эканомікі (301—350).

Абітурыент-2019

# У БДУІРы павялічаць набор

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі зацверджаны праект парадку прыёму на 2019 год. Пра гэта падчас Дня адкрытых дзвярэй паведаміў адказны сакратар прыёмнай камісіі ўніверсітэта Васіль БАНДАРЫК.**

«Мы ўтрая павялічваем набор на спецыяльнасці па інтэграваных планах для выпускнікоў каледжаў на дзённую скарочаную форму атрымання адукацыі. Акрамя таго, плануем павялічыць набор на дзённую поўную (чатырохгадовую) форму атрымання адукацыі і колькасць месцаў для замежных студэнтаў», — паведаміў ён.

Таксама ў БДУІРы будзе дапрацавана і сістэма аўтаматызаванага залічэння, каб забяспечыць большую манеўранасць абітурыентаў. Напрыклад, тыя, хто планаваў паступаць на скарочаную форму атрымання адукацыі, змогуць падаваць дакументы на вячэрнюю або дзённую форму.

«Асаблівую ўвагу мы ўдзяляем дыстанцыйнай форме навучання, — расказаў **прарэктар па вучэбнай рабоце ўніверсітэта Барыс НІКУЛЬШЫН.** — Апошняя ініцыятыва — стварэнне цэнтра дыстанцыйнай адукацыі па ІТ-тэхналогіях з ПВТ. Мы збіраемся рэалізаваць дадзены праект ужо ў гэтым навучальным годзе».

Дарэчы, у БДУІРы шырока развіта дадатковая адукацыя: «Мы прасунуліся далей за ўсіх па наладжванні сумеснай работы з заказчыкамі кадраў. У верасні ў нас адкрылася чарговая сумесная лабараторыя, — падкрэсліў Барыс Нікульшын. — Ужо з другога курса заказчыкі пачынаюць працаваць з нашымі студэнтамі. Зараз у ІТ увогуле немагчыма працаваць без атрымання дадатковай адукацыі».

Нагадаем, што ў гэтым годзе ў БДУІРы вырас сярэдні бал залічаных на бюджэт — да 339 балаў. Прахадныя балы для тэхнікатэхналагічнага профілю вагаліся ад 268 да 370 балаў, а для эканамічнага профілю — ад 377 да 384 балаў. Наступны Дзень адкрытых дзвярэй пройдзе ў БДУІРы вясной.

Класныя навіны

# Найлепшыя ў геаграфіі і... фізічнай культуры

**У бягучым навучальным годзе Міністэрства адукацыі ўпершыню правядзе рэспубліканскую школьную алімпіяду па фізічнай культуры і спорце.**

Як расказала журналістам **кансультант Галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Анжэла КУДАЯРАВА,** да 2015 года алімпіяды сярод школьнікаў праводзіліся па 16 вучэбных прадметах, а з 2015-га ў пераліку алімпіядных дысцыплін з'явілася кітайская мова.

Рэспубліканскі алімпіядны рух — гэта ўнікальны праект, у якім задзейнічана больш як паўмільёна навучэнцаў і сотні настаўнікаў. На першым і другім этапах (школьным і раённым) вучням даецца магчымасць выступаць па некалькіх вучэбных прадметах. Але на трэцім (абласным, мінскім гарадскім) і рэспубліканскім этапах навучэнец павінен выбраць адзін вучэбны прадмет.

— Штогод для абласнога і рэспубліканскага этапаў фарміруецца склад распрацоўшчыкаў алімпіядных заданняў. Гэтыя заданні ў адзін і той жа дзень даводзяцца да ўсіх рэгіёнаў краіны і Мінска. Таксама штогод зацвярджаецца склад журы заключнага этапу алімпіяды, куды ўваходзяць выкладчыкі ўстаноў вышэйшай адукацыі з усіх рэгіёнаў, найлепшыя педагогі па кожным прадмеце і метадысты інстытутаў развіцця адукацыі, — паведаміла Анжэла Кудаярава. — Акрамя каманд з абласцей і Мінска, у заключным этапе асобна прымае ўдзел каманда ліцэя БДУ.

У папярэднім навучальным годзе на першым, школьным, этапе алімпіяды ўзялі ўдзел каля 600 тысяч навучэнцаў, а на заключным — паўтары тысячы чалавек з усіх рэгіёнаў краіны.

«Рэспубліканскія школьныя алімпіяды — гэта аснова піраміды па выяўленні і рабоце з адоранымі навучэнцамі, а яе вяршыня — удзел нашых школьнікаў у міжнародных школьных алімпіядах, — падкрэслівае спецыяліст міністэрства. — Напрыклад, сёлета за мяжой гонар нашай сістэмы адукацыі адстойвалі 58 навучэнцаў і 50 з іх вярнуліся з узнагародамі. Скарбонку беларускай школы папоўнілі 5 залатых, 19 сярэбраных і 26 бронзавых медалёў.

На некаторых міжнародных алімпіядах для школьнікаў, як, напрыклад, на алімпіядзе па геаграфіі, рабочай мовай з'яўляецца англійская, таму толькі ведання геаграфіі для пападання ў зборную аказваецца недастаткова. Адбор на алімпіяду вядзецца з улікам свабоднага валодання англійскай мовай.

Міжнародная геаграфічная алімпіяда (iGeo) праводзіцца пад патранатам Міжнароднага геаграфічнага саюза пачынаючы з 1996 года. Першапачаткова спаборніцтвы арганізоўваліся раз на два гады, а з 2012-га ладзяцца штогод. Іх праграма ўключае тры асноўныя этапы: тэарэтычны, палявы і мультымедыйны. Навучэнцы абследуюць мясцовасць, аналізуюць матэрыялы праведзеных палявых назіранняў і статыстычныя звесткі, думаюць над тэарэтычнымі і прыкладнымі пытаннямі і задачамі.

XV Міжнародная геаграфічная алімпіяда праходзіла сёлета ў Квебеку (Канада) з удзелам школьнікаў з 43 краін свету. На прэстыжным міжнародным першынстве беларуская каманда заваявала тры сярэбраныя ўзнагароды.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Прыродная спадчына

# ТУРЫЗМ У ГУМАВЫХ БОТАХ

## Чаму за балотамі наша будучыня?

**Дзікае — адно з найбуйнейшых у Еўропе нізінных балот, якія захаваліся ў выглядзе блізкім да натуральнага. Яму больш за шэсць тысяч гадоў. Падобных балот у Еўропе засталося толькі чатыры. Таму гэта аб'ект унікальны не толькі для Беларусі. Ці праўда, што тут сустракаецца расліна, сок якой у Старажытнай Грэцыі выкарыстоўвалі як атруту, і жыве птушка, якой баіцца нават мядзведзь? Даведацца пра гэта можна было падчас палявога семінара, арганізаванага грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Спецыялісты прэзентавалі таксама вынікі даследавання пра ваўкоў Белавежскай пушчы, за якімі назіралі на працягу некалькіх гадоў.**

## МУЗЕЙ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

Дзікае ляжыць на водападзеле басейнаў Чорнага і Балтыйскага мораў і сілкуе абодва сваёй вадой. Глыбіня балота — да трох метраў, з якіх паўтара прыпадаюць на тарфяныя залежы.

Гэта месца багатае на рэдкіх раслін і птушак. Тут можна сустрэць 32 віды флоры і 49 фаўны, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Напрыклад, вяртлявая чаротаўка — самая рэдкая і адзіная глабальна пагражальная вераб'інападобная птушка кантынентальнай Еўропы. У Беларусі знаходзіцца 30 працэнтаў усіх вяртлявых чаротавак свету, таму наша краіна мае ключавое значэнне ў захаванні іх папуляцыі. Асноўныя месцы пражывання гэтых птушак — балоты Званец, Споранскае і Дзікае. На апошнім налічваецца 170—200 самцоў гэтага віду.

Яшчэ адна птушка, што мае статус уразлівай, — вялікі арлец. У нашай краіне жыве 15—20 працэнтаў еўрапейскай папуляцыі гэтага віду. Прычым балота Дзікае і Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік — адзіныя месцы, дзе іх колькасць вырасла. На Дзікім налічваецца толькі шэсць пар вялікага арляца.

Прыязджаюць сюды і для таго, каб паназіраць за барадатай няясыццю. **Спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Мікалай ЧЭРКАС** заўважае, што птушка вельмі баявая — нават мядзведзь яе баіцца. У савецкай арніталогіі вядомы два выпадкі, калі навукоўцы пасля сустрэчы з няясыццю заставаліся без вока. Каб падабрацца да птушкі, даследчыкі нават хакейны шлем надзявалі, пакуль не вывучылі яе звычкі.

Калі хочаце палюбавацца тутэйшымі раслінамі, лепш прыязджаць у маі — чэрвені. На Дзікім расце шабельнік балотны, які мае лекавыя ўласцівасці, бабок трохлісты з экзатычнымі пушыстымі кветкамі і атрутная цыкута. Па легендзе менавіта апошняй атруціўся Сакрат. Але гэта няпраўда: цыкута ў Грэцыі не расце — асуджаным на смерць там давалі выпіць сок балігалову.

## КАЛІ ВОЎК — ВЕГЕТАРЫЯНЕЦ

На балотах можна таксама сустрэць ваўкоў. Пра іх паводзіны беларускія навукоўцы могуць шмат расказаць — папуляцыя жывёл вывучалася з 2013 года ў рамках пяцігадовай Міжнароднай прыродаахоўнай праграмы, падпісанай нацыянальным паркам «Белавежская пушча», грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Франкфурцкім заалагічным таварыствам (Германія). Назіралі за ваўкамі з дапамогай GPS-ашыйнікаў: датчыкі праз кожныя дзве гадзіны здымалі каардынаты і перадавалі іх, калі драпежнік знаходзіўся ў зоне сотавай сувязі. Даследчыкі выкарыстоўвалі таксама фотапасткі і самі наведвалі месцы, дзе праходзілі жывёлы.



Балотаступы, якія насілі раней у гэтай мясцовасці.

— Што такое воўк для запаведнай тэрыторыі? Гэта яе сёння і заўтра, бо ён стаіць на вяршыні харчовага ланцужка і рэгулюе экасістэму, — тлумачыць Мікалай Чэркас.

За дзень драпежнік прабягае каля 15 кіламетраў. Многія думаюць, што ён ходзіць, дзе захоча, але гэта не так. Насамрэч у ваўкоў ёсць канкрэтная тэрыторыя, і яны трымаюць межы. У зграі ёсць свае ахоўнікі, якія гэтыя межы патрулююць.

Упачатку даследавання часта фіксавалі выпадкі, калі польскія ваўкі прыбягалі да нас і праводзілі рэйды. Гэта можна было вылічыць па тым, што беларускія драпежнікі ўцякалі да вёсак і дарог. Зграі ў суседніх ваўкоў былі большыя (да 10 асобін), таму беларускім даводзілася адступаць. Але, калі ў пушчы ўвялі мараторый на адстрэл гэтых жывёл, такія сітуацыі сталі рэдкасцю. Нават памежнікі казалі, што падкопаў пад калючым дротам стала меней. Цяпер, праўда, мараторый ужо не дзейнічае, што ў навукоўцаў выклікае хваляванне.

Харчуюцца ваўкі ў асноўным аленямі. Так жывёлы выконваюць функцыю санітараў лесу, бо алені абгрызаюць лісце і парасткі маладых дрэў, чым перашкаджаюць натуральнаму ўзнаўленню лесу. Некаторыя зграі спецыялізуюцца на здабычы ласёў. А адзін з ваўкоў, за якім вялі назіранне, наогул аказаўся амаль вегетарыянцам: у яго рацыёне былі ў асноўным яблыкі, грушы і палёўкі.

Ці часта драпежнікі забягаюць у вёскі? Падчас назірання адна зграя наведала 10 населеных пунктаў, а вось воўк-адзіночка — 36. Але небяспекі няма, бо ў самі вёскі жывёлы не заходзяць — глядзяць здалёк. Лёжкі драпежнікаў часта знаходзяцца за 100—150 метраў ад дарог, але людзі іх не бачаць.

— У ваколіцах Белавежскай пушчы ніводнага выпадку нападку ваўка на чалавека не зафіксавана. А ўсе выпадкі нападу на свойскіх жывёл, пра якія даведваліся са слоў жыхароў, мы пераправяралі, і яны не пацвярджаліся, — дзеліцца Мікалай Чэркас.

## НАВОШТА ТУТ КАСІЦЬ?

Пытанне, якое цяпер стаіць перад даследчыкамі, — як захаваць балота для наступных пакаленняў? З-за меліярацыі 40 працэнтаў тэрыторыі Дзікага адчувае асушальнае ўздзеянне. Да таго ж балота зарастае травой і кустоўем.

Адна з прапаноў — праводзіць тут кашэнне. **Дзмітрый ГРУМО, намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі,** расказаў пра эксперымент, які ставілі на балоце. На адным з участкаў зрабілі разавае кашэнне. У першыя гады пасля гэтага павялічылася відавое багацце флоры і фаўны, палепшылася захаванне водна-балотных відаў. Але праз два-тры гады станоўчы эфект знікае. На другім участку, дзе арганізавалі рэгулярнае кашэнне (кожнае лета), відавое багацце наадварот пачало скарачацца, рэзка павялічвалася колькасць кустоўя. Таму навукоўцы прыйшлі да высновы, што кашэнне варта паспрабаваць праводзіць раз на тры гады. Выкарыстоўвацца для гэтага будзе сучасная тэхніка: яна не прыводзіць да глыбокіх механічных пашкоджанняў глебы. Сена гатовы забіраць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы.

Некалі, дарэчы, балота касілі ўручную мясцовыя жыхары. **Дырэктар Навадворскай сярэдняй школы Свіслацкага раёна Ала ГАНЧАРЭВІЧ** успамінае, як у дзяцінстве яны класа з сёмага хадзілі на Дзікае па сена.

— Гэта пякельная праца! Каб дабрацца да свайго ўчастка, трэба было 10 кіламетраў праехаць па дарозе — і не па асфальце — і потым гадзіну, а то і болей, ісці па балоце. Вада стаяла па калена. Касілі асаку сантыметраў на 10—15 вышэй ад вады. Калі трава падсыхала, у цэнтры ўчастка рабілі насціл (секлі для гэтага вольху ці бярозу) і складалі стог. І ўжо ўзімку, калі балота замерзне, вывозілі сена на санях. На Дзікае прыязджалі не толькі з Новага Двара, а практычна з усяго раёна — і з Гарнастаевіч, і са Свіслачы. Цяпер да гэтага, вядома, ніхто не вернецца. У нас раней 50 кароў было толькі на адной вуліцы, а цяпер шэсць на ўсю вёску, таму сена і так дастаткова.

У планах таксама — аднаўленне гідралагічнага рэжыму тэрыторыі. Навукоўцы прапануюць усталяваць дамбу з паўднёвага боку балота, каб абмежаваць уплыў на яго меліярацыйнай сістэмы.

Ёсць тут і перспектыва для развіцця экалагічнага турызму. Успамінаюць выпадак, калі жанчына са Швейцарыі адмыслова прыязджала на беларускае балота: у яе былі праблемы з пазваночнікам, і доктар раіў ёй хадзіць па зыбкай паверхні. Так што экскурсіі могуць быць не толькі пазнавальныя, але і лячэбныя.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

# ТАЯМНІЦЫ АРГАНА

**У Беларусі аднаўляецца вывучэнне ўнікальнага музычнага інструмента — аргана. Кніга «Арганы Беларусі» серыі «Энцыклапедыя рарытэтаў», якая выйшла ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», можа стаць добрым дапаможнікам для вывучэння культурнай глебы беларускага народа праз гісторыю арганнага мастацтва.**

— Упершыню мы сабралі ў адной кнізе тое, што пакінута нашымі нашчадкамі, чым мы можам ганарыцца, што павінны захоўваць і, самае галоўнае, развіваць. Ідэя праекта ляжала на паверхні, бо задача нашага выдавецтва — рабіць менавіта такія кнігі, — заўважае **дырэктар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.** — Таго, што занатавана, дагэтуль не існавала нідзе. Выданне — добрая платформа і аснова для даследчыкаў арганнай музыкі і культуры арганаў увогуле. Адштурхоўваючыся ад яго, мы яшчэ прадставім не адно выданне, якое будзе адпавядаць гэтай тэматыцы, а таксама знойдзем шмат навуковых артыкулаў у гэтым кірунку. І самае значнае — мы пачуем урачыстую музыку арганаў, бо яна вельмі адпавядае душы беларусаў.

Багата ілюстраваная кніга грунтуецца на глыбокай навуковай глебе: гісторыя з'яўлення і ўзвядзення арганаў, развіццё арганнага выканальніцтва, імёны выдатных арганістаў, кампазітараў, майстроў, дэспазіцыі і тэхнічныя характарыстыкі кожнага аргана Беларусі.

Даследаванне арганаў заняло амаль год, а экспедыцыя складальніка, матэматыка-арганіста, Аляксандра Бурдзялёва і фатографа выдавецтва Анатоля Дрыбаса ў пошуках ацалелых арганаў доўжылася 39 дзён. «Арганы Беларусі» выйшлі пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі і падрыхтаваны пры ўдзеле Беларускага фонду культуры і Беларускай акадэміі музыкі.

Складальнікі заўважаюць, што большая частка ўнікальных музычных інструментаў ужо не дзейнічае. Але арганная музыка — гэта кірунак, які своеасаблівым чынам звязвае еўрапейскую культуру з усходнеславянскай, яе называюць сведкай беларускай гісторыі, цесна звязанай з гісторыяй канфесій. Таму аднаўленне гэтага кірунку вывучэння мае свой плён.

— Я разглядаю гэтую кнігу як пачатак рэалізацыі доўгатэрміновай грамадска-дзяржаўнай праграмы па адраджэнні старадаўніх арганаў на Беларусі. Гэта вельмі важны кірунак дзейнасці, і я невыпадкова называю яго грамадска-дзяржаўным, паколькі арганы ў абсалютнай большасці знаходзяцца ў касцёлах, якія з'яўляюцца ўласнасцю прыходаў, а дзяржава тут можа толькі спрыяць і дапамагаць. Асноўную нагрузку і ролю павінна ўзяць на сябе грамадскасць. Прыклад некаторых касцёлаў паказвае, што дзякуючы намаганням многіх людзей, перш за ўсё прыхаджан, арганы рэстаўруюцца і аднаўляюцца, — адзначае **старшыня Беларускага фонду культуры Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ.**

**Яўгенія ШЫЦЬКА.**

# ХОБІ, ЯКОЕ ВЫРАТОЎВАЕ

## Ад якіх хвароб можна пазбавіцца з дапамогай любімага занятку?

**А ПОШНІМ часам хобі-тэрапія становіцца ўсё больш распаўсюджаным спосабам лячэння многіх немачаў. Падчас заняткаў любімай справай мы на пэўны час абстрагуемся ад паўсядзённай мітусні, праяўляем сваю індывідуальнасць і творчыя задаткі, што зніжае нервовае напружанне, здымае стрэс і паляпшае наш настрой. І гэта далёка не ўсе станоўчыя эфекты хобі.**

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Калі казаць пра карыснае для здароўя баўленне вольнага часу, то гэта, канешне, не прагляд тэлевізара ці чытанне апошніх літаратурных бестселераў, — кажа **ўрач-псіхатэрапеўт Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера г. Мінска Іна ЦЕЛЕШ.** — Такога роду заняткі хутчэй наадварот выклікаюць пачуццё непаўнацэннасці, трывогі, унутранай спустошанасці і могуць паглыбіць дэпрэсію. Станоўчы ўплыў на стан здароўя аказваюць творчыя хобі, напрыклад рознага роду рукадзеллі.

### У ЧЫМ КАРЫСЦЬ?

Чаму творчыя заняткі так жыватворна дзейнічаюць на нашу псіхіку?

— Справа ў тым, што ў паўсядзённым жыцці нас часта адольваюць непрыемныя думкі і трывогі. Калі ж мы ўкладваем усю сваю псіхічную энергію ва ўзаемадзеянне — з чалавекам, палатном, музычным інструментам, — мы быццам бы становімся часткай сістэмы, большай за нашу індывідуальнасць. І трывога змяншаецца, — тлумачыць Іна Целеш.

Яна прыводзіць прыклад, як вядомы расійскі псіхіятр, прафесар Марк Бурно лячыў цяжка хворых на шызафрэнію метадам творчага самавыражэння. У выніку яго пацыенты пачыналі адчуваць жыццё, узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, імкнуцца расказаць пра сябе праз творчасць.

— Дык вось, калі мастацтва выратоўвае людзей нават у такіх экстрэмальных выпадках, то можна ўявіць, як яно здольнае ўздзейнічаць на звычайнага чалавека ў паўсядзённым жыцці, — дзеліцца псіхатэрапеўт. — Даўно даказана, што рукадзелле здымае стрэс і дапамагае скінуць псіхалагічнае напружанне, садзейнічаючы такім чынам аднаўленню нервовай сістэмы. Заняткі, якія патрабуюць канцэнтрацыі ўвагі і ўключаюць дробную маторыку, прымушаюць працаваць нервовыя клеткі ў галаўным мозгу і папярэджваюць развіццё старэчай слабасці розуму (хваробы Альцгеймера).

Акрамя гэтага, падчас заняткаў асобнымі відамі рукадзелля стымулююцца акупунктурныя кропкі, якія непасрэдна ўплываюць на стан здароўя. Так, напрыклад, **вязанне на прутках** дапамагае перажыць цяжкія нервовыя ўзрушэнні і папярэджвае развіццё дэпрэсіі, паляпшае стан пры захворванні нырак і сардэчна-сасудзістай сістэмы. **Вязанне шыдэлкам** карыснае для сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм, стымулюе працу печані і нырак. Сталым жанчынам вязанне шыдэлкам дапамагае змагацца з атэрасклерозам. **Вышыванне** пазбаўляе ад галаўных болеў, здымае нервовае напружанне, жыватворна ўплывае на работу лімфатычных і крывяносных сасудаў. **Бісерапляценне** дапамагае пазбавіцца ад бяссонніцы, нармалізуе абмен рэчываў і садзейнічае паляпшэнню канцэнтрацыі ўвагі, станоўча ўплывае на дыхальную і нервовую сістэмы. **Шыццё** карыснае пры артэрыяльнай гіпертэнзіі, хваробах сэрца, парушэннях сну і галаўных болях.

Любы від рукадзелля карысны для здароўя, але асноўнае значэнне мае той факт, што ад заняткаў любімай справай чалавек атрымлівае безліч станоўчых эмоцый, якія падаўжаюць маладосць, паляпшаюць настрой і здароўе.

### ЯК ЗНАЙСЦІ СВАЁ ХОБІ?

Выбіраць варта з таго, што вам даспадобы, што дастаўляе радасць і задавальненне. Разнастайных заняткаў сёння шмат, і калі традыцыйныя вязаныя шалікі, сурвэткі і пацеркі вас не натхняюць, то можна знайсці і больш сучасныя і менш растыражаваныя заняткі. Вось некалькі прыкладаў цікавых хобі.

**Квілінг, ці папераскручэнне** — мастацтва стварэння плоскіх і аб'ёмных кампазіцый з дапамогай скручаных у спіралькі вузкіх і доўгіх палосак каляровай паперы. Прыдаючы розную форму спіралькам, вырабляюць асноўныя элементы квілінгу, з якіх ствараюць кампазіцыі. У гэтай тэхніцы выконваюць карціны, паштоўкі, альбомы, рамкі для фотаздымкаў, розныя ўпрыгожанні для інтэр'ера.

**Фелтынг, ці валенне з шэрсці** — стварэнне ўпрыгожанняў, сумак, дэкарыраванне адзення, шалікаў, галаўных убораў з дапамогай спецыяльнай шэрсці і інструментаў.

**Дэкупаж** — асаблівая тэхніка дэкарыравання, якая дазваляе ўпрыгожыць любую паверхню: кераміку, дрэва, пластмасу, паперу, шкло. Сутнасць гэтага спосабу — у скрупулёзным выразанні і наклейванні элементаў з папяровых сурвэтак, паколькі багацце розных малюнкаў можа задаволіць любыя запыты. Каб надаць аб'ём, элементы абводзяць спецыяльнымі контурамі, пакрываюць лакамі і інш.

**Пэчворк** — сшыванне розных па колеры і фактуры кавалачкаў тканіны. Усім вядомая коўдра з абрэзкаў — папярэднік гэтага мастацтва. Майстэрства сучасных рукадзельніц прыраўноўваецца да твораў мастацтва.

**Карвінг** — мастацтва фігурнай нарэзкі гародніны і садавіны. З гарбуза, морквы, капусты, кавуна выразаюць кветкі неверагоднай прыгажосці. Апошнім часам стала модна дарыць «букеты» і фруктовыя кошыкі, выраблены ў такой тэхніцы.

Асвоіць гэтыя цікавыя заняткі сёння не складана: ёсць мноства кніг, а ў інтэрнэце можна знайсці бясплатныя курсы і майстар-класы. Галоўнае — жаданне і натхненне!

Справы сардэчныя

# ПАПЯРЭДЗІЦЬ ІНФАРКТ МОЖНА, КАЛІ...



**НА мінулым тыдні ў краіне прайшла рэспубліканская акцыя «Папярэдзім інфаркт міякарда». На сотнях пляцовак па ўсёй Беларусі — у аптэках, паліклініках, буйных гандлёвых цэнтрах, здраўпунктах прадпрыемстваў урачы-кардыёлагі вымяралі ціск і акружнасць таліі пацыентаў, а пры неабходнасці (высокі ціск, частыя болі ў грудной клетцы) выдавалі талоны на абследаванні.**

Сёння каранарная недастатковасць і інфаркт міякарда з'яўляюцца аднымі з галоўных прычын смерці і інваліднасці сярод насельніцтва большасці індустрыяльна развітых краін, і Беларусь — не выключэнне. На думку экспертаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у наступнае дзесяцігоддзе смяротнасць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў будзе няўхільна павялічвацца ў большасці краін свету. За гэты час смяротнасць ад ішэмічнай хваробы можа вырасці сярод жанчын на 80 %, сярод мужчын — на 100 %. Сітуацыя з сардэчна-сасудзістымі хваробамі ў цэлым і інфарктам міякарда ў прыватнасці ў Беларусі таксама выклікае трывогу. Летась толькі ў Мінску, паводле інфармацыі **кіраўніка Гарадскога кардыялагічнага цэнтра на базе 2-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Раісы ЧАЧКО,** выяўлена 3 885 выпадкаў інфаркту міякарда.

— Як паказвае практыка, 60 % хворых не ўсведамляюць небяспеку свайго стану і вельмі позна звяртаюцца па дапамогу ці не звяртаюцца ўвогуле, спадзеючыся, што «як-небудзь абыдзецца», — кажа Раіса Чачко.

### Фактары, якія садзейнічаюць узнікненню інфаркту міякарда

Згодна з канцэпцыяй Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, для Еўрапейскага рэгіёна характэрны сем асноўных фактараў рызыкі ўзнікнення сардэчна-сасудзістых хвароб, у тым ліку інфаркту міякарда.

Да іх адносяцца:

— ужыванне тытуню;

— злоўжыванне алкаголем;

— павышаны артэрыяльны ціск;

— гіперхалестэрынемія;

— лішняя вага;

— недастатковае ўжыванне садавіны і гародніны;

— малярухомы лад жыцця.

Узнікненню інфаркту міякарда таксама садзейнічаюць:

— нервовае перанапружанне і псіхічная траўма;

— цукровы дыябет.

### Первая дапамога і лячэнне

**Первая гадзіна хваробы вельмі важная для своечасовага аказання ўрачэбнай дапамогі!** Страта гэтага часу можа каштаваць жыцця.

**Да прыезду брыгады хуткай дапамогі** варта пакласці хворага на паверхню з прыўзнятым узгалоўем, расшпіліць сціскаючае адзенне, забяспечыць прыток свежага паветра, па магчымасці супакоіць чалавека.

**Для змяншэння болю** неабходна паўторнае прымяненне нітрагліцэрыну пад язык (да трох таблетак з інтэрвалам 5—6 хвілін, хоць пры інфаркце міякарда нітрагліцэрын цалкам не ліквідуе боль, а валідол у гэтых выпадках увогуле неэфектыўны).

**Дадаткова рэкамендуецца** разжаваць адну таблетку аспірыну, прыняць 60 кропляў карвалолу ці валакардзіну.

**Паўнацэннае і своечасовае лячэнне інфаркту міякарда можа быць здзейснена толькі ў стацыянары!**

З 2010 года ў Беларусі актыўна выкарыстоўваюцца інтэрвенцыйныя тэхналогіі лячэння пацыентаў з вострым каранарным сіндромам (ВКС).

У Мінску сістэма аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з ВКС прадстаўлена адзіным каардынацыйным цэнтрам — аддзелам шпіталізацыі Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі, а таксама выязнымі брыгадамі станцый медыцынскай дапамогі Мінска. Аказанне медыцынскай дапамогі пацыентам з ВКС у Мінску ажыццяўляецца ў рэжыме 24 гадзіны сем дзён у тыдзень у шасці ангіяграфічных цэнтрах — 1, 2, 4, 10-й гарадскіх клінічных бальніц, бальніцы хуткай дапамогі і Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі. Прыёмныя, рэанімацыйныя і кардыялагічныя аддзяленні клінік таксама з'яўляюцца неад'емнай часткай гэтай сістэмы. Па словах Раісы Чачко, у Мінску ёсць магчымасці дастаўляць пацыентаў у стацыянары з ангіяграфічным кабінетам з любога пункта горада цягам 20 хвілін.

### Меры прафілактыкі

Для эфектыўнай прафілактыкі большасці сардэчна-сасудзістых захворванняў, у тым ліку інфаркту міякарда, неабходна ў паўсядзённым жыцці прытрымлівацца пэўных правілаў, а менавіта:

— кантраляваць артэрыяльны ціск;

— сачыць за ўзроўнем халестэрыну ў крыві;

— правільна харчавацца;

— займацца фізічнымі практыкаваннямі, весці рухомы лад жыцця;

— не курыць, а калі курыце — усімі сіламі імкнуцца кінуць;

— не злоўжываць спіртнымі напоямі;

— імкнуцца пазбягаць працяглых стрэсаў, не нервавацца з-за дробязяў.

Памятайце, інфаркт міякарда лягчэй папярэдзіць, чым лячыць! У выпадку падазрэння на яго ўзнікненне — неадкладна выклікайце ўрача. Прамаруджванне роўнае смерці.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

Год малой радзімы

# НОВЫ ХРАМ У ГЛЫБІНЦЫ

**У гарадскім пасёлку Копысь Аршанскага раёна Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі асвяціў храм Праабражэння Гасподняга. Для тутэйшых гэта стала сапраўдным святам. Каб прыняць удзел у літургіі, вернікі прыехалі з суседніх вёсак, Оршы і нават Віцебска.**

Сярод афіцыйных гасцей былі старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пенін, старшыня Аршанскага райвыканкама Ігар Ісачанка і іншыя.

Вяскоўцы з удзячнасцю ўспаміналі Прэзідэнта, бо менавіта калі ён наведваў сваю малую радзіму, яны прасілі яго аб рэканструкцыі храма. І вось цяпер пасёлак упрыгожвае новы. Наогул у Копысі шмат робіцца для таго, каб умовы для жыцця былі не горшыя, чым у горадзе.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **настаяцель храма, протаіерэй Сергій ВАРАБ'ЁЎ,** новую царкву пабудавалі менеў чым за год на месцы, дзе быў храм у аварыйным стане. Дарэчы, на гэтым месцы першы драўляны храм з'явіўся яшчэ ў пачатку XVIII стагоддзя.

Паводле слоў **архіепіскапа Віцебскага і Аршанскага Дзімітрыя,** калісьці ў Копысі было сем храмаў. Цяпер дзейнічаюць два. Праўда, ёсць яшчэ адна старая капліца, якую калісьці пабудавалі па просьбе работнікаў кафляных заводаў.

Патрыяршы экзарх падзякаваў усім, хто прымаў удзел у рэалізацыі праекта: праекціроўшчыкам, будаўнікам, дабрачынцам. Сярод тых, хто фінансава дапамог у пабудове храма, — сенатар, генеральны дырэктар кіруючай кампаніі холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марко» Мікалай Мартынаў. Яго Патрыяршы Экзарх узнагародзіў ордэнам святой прападобнай Ефрасінні Полацкай. Між іншым, Мітрапаліт адзначыў узнагародамі і іншых мецэнатаў.

— Новая царква — яшчэ адна крыніца святой вады, ласкі Святога Духа. Храм — гэта неба на зямлі. Той, хто хоча дакрануцца да неба, хай прыходзіць сюды на сустрэчу з Богам...

Дарэчы, юнае насельніцтва ў Копысі, дзе жывуць каля 850 чалавек, з задавальненнем наведвае гурток гісторыі і культуры праваслаўя. Тры сястры міласэрнасці групы міласэрнасці пры храме пастаянна наведваюць пацыентаў бальніцы гарадскога пасёлка і тых, хто жыве ў дамах-інтэрнатах у Якаўлевічах і Бабінічах.

Усяго ў Віцебскай вобласці налічваецца 265 культавых аб'ектаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Аршанскі раён — Віцебск.*

Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

**Старыя Войкавічы Баранавіцкага раёна**

# «У ВАКОЛІЦЫ НАС НАЗЫВАЛІ ВАРШАВАЙ»

**У Старых Войкавічах, вёсцы з цікавай гісторыяй, засталося зусім мала жыхароў. Зарэгістравана пяць, а пастаянна пражываюць трое. Летам яшчэ дачнікі бываюць наездамі. Ды большасць насельніцтва вёскі складае сям'я: Альбін Баляслававіч Вярбіцкі і яго дачка Роза. Роза Альбінаўна пасля выхаду на пенсію пераехала ў вёску, бо бацьку, якому за 80, аднаго не пакінеш, яму патрабуецца дапамога.**

**Альбін ВЯРБІЦКІ з дачкой Розай.**

## ТРАДЫЦЫІ БАБУЛІ АЛЕНЫ

Але яшчэ ледзь не да сёлетняй вясны 86-гадовы дзядуля Альбін ездзіў на службу ў сталовіцкі касцёл на ўласным «жыгулёнку». Калгасны шафёр амаль з 40-гадовым стажам тэхніку любіць і ў машыне пачуваецца нібы рыба ў вадзе. Толькі вось апошнім часам здароўе пагоршылася, і дзеці не дазваляюць яму самому садзіцца за руль. Цяпер, калі выпадае, сын возіць бацьку на нядзельнае богаслужэнне.

Роза Альбінаўна ўсё жыццё адпрацавала ў галіне культуры Баранавіцкага раёна, культуры прысвяціў сябе і яе брат Казімір. Гэта ў іх, пэўна, ад бацькоў. Яны хоць і працавалі ў калгасе, вялі сваю вялікую гаспадарку, але не прапускалі ніводных вячорак, любілі спяваць, танцаваць, заўсёды былі аптымістамі па жыцці, расказвае дачка. А ў доме ўсім кіравала бабуля Алена, бацькава маці — гэта ўжо ўспаміны дзяцінства Розы: «Бабуля ведала ўсе малітвы, рэлігійныя абрады. І кожны вечар у нас збіраліся на «маёву». Так называлася вячэрняя сумесная малітва. Суседзі ўпраўляць хатнія справы, дагледзяць скаціну, як у нас казалі, «падробяцца», і прыходзяць да нас на чыстую палавіну дома. Там бабуля ўзначальвала малітву — пацеры. Потым, звычайна, пасядзяць, пагавораць. Я яшчэ малая была, не вельмі магла ацаніць тыя пасядзелкі, але мама пазней гаварыла, што размовы былі вельмі добрыя, без аніякіх плётак, абмяркоўвалі ўласную гаспадарку, давалі адно аднаму парады. Цікава, што не толькі католікі збіраліся на «маёву», прыходзілі і праваслаўныя вяскоўцы. Дружна жылі, хораша».

— Аднойчы быў дужа смешны выпадак, — працягвае Роза Альбінаўна. — Да малодшай бацькавай сястры прыходзіў хлопец з суседняй вёскі, праваслаўны. Дык вось аднойчы ён зайшоў вечарам, убачыў, як жанчыны моляцца і адразу закрыў дзверы. «Вой, нехта памёр, а я і не ведаў», — сказаў ён сваёй нявесце, яна ў адказ толькі засмяялася. Потым яны пажаніліся з Алінай, і ён на правах члена сям'і ўдзельнічаў у тым ліку і ў вячэрніх малітвах.

Усе збіраліся ў нас, значыць, жаночая палова сям'і старанна сачыла за чысцінёй і парадкам у доме, так было заведзена бабуляй Аленай. Цяпер усведамляю, што гэта і было часткай нашага выхавання сямейнай традыцыі. Потым мама падтрымлівала дом, а цяпер вось — я.

## ЯК АДНА СЯМ'Я

Гаспадыня паказвае вышытыя абрусы і пакрывалы, падушкі — усё яна стараецца выкарыстоўваць, каб мёртвым цяжарам не ляжала ў шафах. І пакоі, расквечаныя вырабамі ўмелых рук былых гаспадынь, выглядаюць крыху святочна-ўрачыста. Звяртаю ўвагу на эксклюзіўную драўляную мэблю. Аказваецца, усё зроблена яшчэ дзедам Розы Альбінаўны. На прапановы прадстаўнікоў маладзейшага пакалення сям'і змяніць інтэр'ер на сучасны гарадскі яна не паддаецца. Хай будзе, як раней. А ў двары каля сцяны хлява цяперашняя гаспадыня зрабіла нешта накшталт этнаграфічнага музея. Сабрала старадаўнія прылады працы, рэчы, інструменты — хоць экскурсіі сюды вадзі.

Двор Вярбіцкіх патанае ў кветках, Роза Альбінаўна сама прыдумвае малыя архітэктурныя формы і ўвасабляе іх у жыццё. Паводле слоў **старшыні Сталовіцкага сельскага Савета Мікалая ГРЫБАВА,** летась на конкурсе-аглядзе падворкаў Вярбіцкія атрымалі дыплом пераможцаў.

— Так было заведзена не толькі ў маіх бацькоў, але і ў суседзяў, ва ўсіх жыхароў нашай вёскі, — разважае Роза Вярбіцкая. — Парадак не толькі ў доме, але і на падворку — гэта норма для добрага гаспадара.

Яшчэ яна расказала, што вельмі дружныя ў іх людзі былі заўсёды. Любое вяселле, хрэсьбіны, пахаванне станавілася справай і клопатам усёй вёскі.

— Як у нас памёр дзед, зіма была снежная, намяло, здаецца, па пояс, — успамінае Роза Альбінаўна. — Прыйшлі ледзь не ўсе мужчыны з вёскі з лапатамі і расчысцілі дарогу. Пры гэтым ніхто іх не прасіў загадзя. Гэта было само сабой зразумела. І так ва ўсім. Можа, таму нашы Старыя Войкавічы ў вакольцы і называлі «Варшавай», а не толькі таму, што пераважная большасць насельніцтва складалі католікі. А яшчэ, відаць, таму, што ў мясцовых людзей у пашане былі пісьменнасць, адукацыя. Усе імкнуліся дзяцей вывучыць нават у цяжкія пасляваенныя гады. Колькі адметных людзей выйшла з нашай вёскі! У нас самыя распаўсюджаныя прозвішчы Вярбіцкія і Каласоўскія. Ды каго ні вазьмі: напрыклад, Станіслаў Каласоўскі выгадаваў двух сыноў. Багуслаў Станіслававіч быў доўгі час галоўным дзяржаўным санітарным урачом Мінска, яго брат Вацлаў кіраваў аптэкамі Мінска і Мінскай вобласці, праўда, даволі даўно. А сын Вяржбіцкага Эдуарда (палову вёскі запісалі як нас Вярбіцкімі, другую палову на польскі манер Вяржбіцкімі) быў да пенсіі галоўным урачом Бярозаўскай раённай бальніцы, па сутнасці будаваў яе, ствараў. У культуру пайшлі не толькі мы з братам, ёсць і іншыя калегі сярод аднавяскоўцаў.

Цяпер, калі на малую радзіму зазірае хто з нашчадкаў ранейшых жыхароў, сустракаемся нібы з роднымі. Стараюся прывеціць, стол накрыць, як некалі мама рабіла. Вось і нядаўна зайшоў адзін мінчанін-зямляк і прасіў: «Не накладвай, Роза ў прыгожыя талеркі, не засцілай абрусы, давай мы па-беларуску, як дзяды рабілі, на кружку закусім». Ну і нарэзала на круглай дошцы сала тоненька, агурка таксама, кілішачак наліла, і так хораша мы пасядзелі, успомнілі дзяцінства. Бацькі некалі многа і цяжка працавалі, а як выпадала нейкая нагода, маглі хуценька арганізаваць вось такі стол.

— А цяпер што, — разгаварылася гаспадыня, — засталіся ўспаміны ды родныя магілы. Мы з братам даглядаем 14 магіл, усе астатнія сваякі далей жывуць, прыязджаюць раз у год на памінальныя дні... А мы вось з бацькам тут застаёмся, бо ён і слухаць не хоча, каб куды са сваёй хаты выехаць. Дарогу нам зімой расчышчаюць, аўтакрама прыходзіць, што яшчэ трэба для нармальнага жыцця?

## ДЛЯ ТУРЫСТАЎ І ДАЧНІКАЎ

— Мясціны прыгожыя, як на мой погляд, дык для дачнікаў, адпачывальнікаў тут рай, — працягвае аповед Роза Альбінаўна. — А гэтым летам цікавы чалавек завітаў на мой падворак. Спыніўся, выйшаў з машыны, папрасіў вады папіць з калонкі. З ім дзеці былі, то я запрасіла ў хату, каб не вельмі халодную ваду пілі. А ён прайшоў па хаце і выклаў не зусім звычайную просьбу: «Пераязджайце, кажа, на летнія месяцы ў маю кватэру, а мы з сям'ёй прыедзем сюды, мае дзеці хоць пабегаюць». А я сказала, што ў мяне і свая кватэра ў горадзе ёсць, я б яму ўступіла хату, але бацька не пагодзіцца, бо для яго «на паверсе сядзець» за кару хіба толькі.

Прыязджаюць сюды і турысты. Не так далёка — вядомы канцэнтрацыйны лагер часоў вайны — Калдычэва. Роза прыгадвае расказы бабулі, як баяліся людзі ў вайну, нават ямы-зямлянкі для схованкі капалі, калі паветра напаўнялася едкім дымам, у Калдычэве палілі людзей... Але пранесла, Старыя Войкавічы акупанты не зачапілі. А вось у Першую сусветную вайну тут вяліся цяжкія баі. Ёсць гістарычныя звесткі пра Скробава-Гарадзішчанскую аперацыю летам 1916 года, у якой загінула каля 7000 салдат расійскай арміі. Пры гэтым было захоплена ўсяго толькі адно нямецкае ўмацаванне на краі вёскі Старыя Войкавічы. У напамін аб тых падзеях у лесе стаіць помнік. А па ўсёй вакольцы захаваліся доты ад тых жорсткіх баёў. «Не так даўно, — расказвае наша гераіня, — на матацыклах прыехала вялікая група моладзі. Думаю: байкеры на адпачынак, на прывал сабраліся. А яны паставілі сваю тэхніку, выстраіліся у рад, навялі парадак вакол помніка. Вось якая ў нас добрая і свядомая моладзь. Гэта я для тых, хто любіць лаяць байкераў, маўляў, лётаюць без тармазоў у галовах, равуць маторамі. Як відно, усялякія і сярод іх бываюць... Летам у нас, вядома, весялей. Бо насельніцтва павялічваецца ў разы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 61-66-90

